Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпаралі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нашпаралі насьпрад тэксту	1 р. — к.
За радок нашпаралі нерад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьцешная на 50 проц. даражэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 160 (2348) Пятніца, 13-га ліпеня 1928 г.

Слова за райённымі камісіямі

Вучот аб'ектаў абкладаньня па сельска-гаспадарчаму падатку падыходзіць к канцу. Прыкладна з 10-15 ліпеня па ўсіх округах прыступаюць за працы па налічэньню падатку.

Мы ўжо няраз падкрэсьлівалі, што ад правяденьня вучоту аб'ектаў абкладаньня залежыць посьпех усёй кампаніі па сельска-гаспадарчаму падатку, бо папраўкі ў законе гэтага году, галоўным чынам, маюць на ўвазе дасканальна высьветліць прыбыткі больш моцных груп. Гэтае-ж магчыма толькі пры больш точным вучоце даходаў бо, дапускаючы грубыя памылкі пры самым вучоце, мы пазбаўляемся магчымасьці выправіць гэтыя памылкі ў павышэньні прагрэсіі і процантвай надбаўкі да вучэнага даходу.

Як-жа ў БССР мы справімся з гэтай адказнай задачай?

Праўда, упаўне закончаных даных па округах няма, але ўжо на падставе тых зьвестак, якія мае Наркамфін, мы можам адказаць на гэтае пытаньне.

Пры выданьні закону аб сельска-гаспадарчым падатку каб атрымаць намечаную ў бюджэце суму, Наркамфін арыентаваўся на разьліках, што пашня ў сярэднім павялічыцца на 5 проц., луга—на 3 проц., буйная рагатая жывёла—на 6 проц., коні—на 4 проц., сьвіньні—на 50 проц. і ніземляробскія заработкі—на 100 процантаў і г. д.

Мы зараз ня маем вестак па рэспубліцы, але па даных, якія мае НКФ на 1 ліпеня, відаць, што нашы арыентыровачныя разьлікі амаль апраўдаліся: па пашні з невялікім недахватам, па лугах—з перавышэньнем заданьня, па рагатай жывёле і конях прыкладна па нашых разліках, па сьвіньнях—на 30-35 проц.

Аднак трэба сказаць, што ўвогуле вялікіх адхіленьняў ад вызначанага НКФ росту ня будзе, бо ў нашы даныя не ўваходзяць поўнасьцю тыя папраўкі, якія ўнесены дзякуючы фактычнай праверцы на мясцох. Гэта дае магчымасьць сьцьвярджаць, што, не зважаючы на надзвычайныя цяжкасьці, якія сустрэліся пры выяўленьні аб'ектаў абкладаньня, кампанія па вучоту аб'ектаў абкладаньня дала параўнальна станоўчыя вынікі.

Разам з тым мы сьцьвярджаем, што ня ўсё тое, што можна было зрабіць, зроблена. Маецца шмат фактаў недастатковай увагі з боку сельсаветаў да гэтага пытаньня.

Цяжкая задача для сельсаветаў амаль скончылася і цэнтр цяжару зараз пераносіцца ў райвыканкомы. Перад райённымі падатковымі камісіямі стаіць надзвычайна цяжкая праца па канчатковым зацьверджаньні даходаў ад няземляробскіх заработкаў, вызначэньню асоб, якія падлягаюць абкладаньню ў індывідуальным парадку, і па вылічэньню падатку.

Райённыя падатковыя камісіі могуць і павінны выправіць дапушчаныя сельскімі вучотнымі камісіямі памылкі. Ад уважлівых адносін нашых райённых камісій да гэтай працы залежыць вельмі многа. Да таго-ж неабходна памятаваць, што мы абмежаваны тэрмінам, бо ўся гэта вялікая праца павінна быць праведзена в такім разрахунках, каб пасьпець у вызначаны СНК тэрмін распачаць працу па ўручэньню плацельшчыкам акладных лістоў.

Зразумела, што ад працаўнікоў райённых падатковых камісій мы маем права вымагаць куды больш, чым ад сельскіх вучотных камісій.

І так, слова за райённымі камісіямі. Яны павінны даказаць, што наша законнае патрабаваньне імі будзе выканана.

КАРДАШЭНКА.

Вэнізэлос ў саюзе з рэфармістамі ліквідуе забастоўку.

(*З газэты „Правда“*).

МАСКВА. «Правда» ў палітычным агляде Грэцыі піша: „Апошнія тэлеграмы паведамляюць, што рэфармісцкая фэдэрацыя працы ў згодзе з урадам ліквідуе забастоўку. Прычыны, у моц якіх рэфармісты палічылі іменна гэты момант найбольш добрым для зрыву забастоўкі, хаваюцца ў прыходзе да ўлады Вэнізэлоса. Вэнізэлос, які мае ў Грэцыі рэпутацыю „нацыянальнага героя і стварыцеля вялікай Грэцыі“ з прычыны таго, што ў часе сусьветнай вайны ён здолеў своечасова і на выгадных умовах прадаць англа-францускаму імпэрыялізму кроў грэцкіх салдатаў, зьяўляецца зараз правадыром рэспубліканскай партыі лібэралаў, якая адбівае пераважна інтарэсы сярэдняй буржуазеі і арыентуецца на Францыю. Грэцкай-жа да апошняга часу кіравала кааліцыя з манархістаў і поўманархічна настроеных правых рэспубліканцаў, земляўласьнікаў і прадстаўнікоў буйнага капіталу, якія карыстаюцца дапамогаю Англіі і Італіі. І зразумела, што грэцкія рэфармісты бачаць у «дэмакраце» і францускім агенце Вэнізэлосе ўвасабленьне «рэспубліканскай дабрачыннасьці і справядлівасьці». Урад Вэнізэлоса павінен, па думцы рэфармістаў, выступіць у якасьці «бесстароннята пасрэдніка» ў абвостранай клясавай барацьбе Грэцыі. Зразумела, рэфармісты заклікаюць рабочых да капітуляцыі бяз ніякіх умоў і гарантый. Яны верацъ у «рэспубліканскую справядлівасьць» Вэнізэлоса, бо горш сьмерці баяцца росту рэвалюцыйных настрояў у рабочай клясе. Першыя крокі новага ўраду—вызваленьне ранейшага фашысцкага дыктатара генэрала Пангалоса і скасаваньне праз вячыстны дэкрэт прапарцыянальнай сыстэмы выбараў у парлямант, пры якой толькі і магчыма прадстаўніцтва рэвалюцыйных рабочых партый—досыць поўна характарызуюць курс міністэрства Вэнізэлоса. І трэба быць упэўненым, што грэцкі пралетарыят, які ня схіліўся перад суровымі рэпрэсіямі манархічнага ўраду, здолее абараніць свае патрабаваньні ў тым выпадку, калі „рэспубліканец“ Вэнізэлос у саюзе з рэфармістамі паспрабуе зламаць рух праз раскол яго і дробныя ўступкі».

Забастоўка ў Грэцыі ня спыняецца

ВЕНА, 11-7. Не зважаючы на афіцыйную пастанову рэфармісцкай канфэдэрацыі працы аб спыненьні забастоўкі, фактычна забастоўка адбываецца далей (пад кіраўніцтвам камітэту партыі, вылучанага рэвалюцыйнымі прафсаюзамі. 6-га ліпеня на падставе пастановы саюзу маракоў распачалася забастоўка мэханікаў, качагараў і параходнага складу ў Пірэі (атэнскі порт). На сходзе бастуючых у Пірэі ўхвалена рэзалюцыя пратэсту проці тэрору ўлады і выкарыстаньня штрэйкбрэхераў і матросаў вайсковага флёту апроч бастуючых. Рэфармісцкае кіраўніцтва саюзу маракоў ужо прабуе ліквідаваць забастоўку. Яно залуляе аб сваёй гатоўнасьці абслугоўваць камандаю некаторыя параходы і абяцае зьменшыць ранейшае патрабаваньне аб 50 процантным павялічэньні заработку, калі поўнасьцю патрабаваньня нельга будзе здаволіць. Гаспадары суднаў рашуча адхіляюць усе перамовы па пытаньні аб заработку. Судны ў Пірэі ахоўваюцца вайсковымі сіламі. Урад пагражае мілітарызаваць камэрцыйныя судны на час забастоўкі.

* * *

ВЕНА. Грэцкая рабочая газэта паведамляе, што ўрадавы тэрор з моманту абвяшчэньня забастоўкі даў 15 забітых, 150 параненых, 500 арыштаваных і 31 высланых.

НОВЫ ГРЭЦКІ УРАД.

РОСПУСК ПАРЛЯМАНТУ. НОВЫЯ ВЫБАРЫ

АТЭНЫ, 10-VII. Новы грэцкі ўрад складзен Вэнізелосам (лідэр так званай лібэральнай партыі) 4-га ліпеня. Міністрам замежных спраў назначан Карапанос, міністрам унутраных спраў Завісьцянос. Урад распусціў парлямант і назначыў новыя выбары на 19-га жніўня.

Праэкт амністыі ў Нямеччыне.

Адхіленьне камуністычнага праэкту

БЭРЛІН, 11-7. Прававая камісія рэйхстагу ўхваліла законапраэкт аб амністыі, пададзены ўрадавымі партыямі разам з сацыял-дэмакратамі. Законапраэкт распаўсюджваецца на палітычныя злачынствы, апроч злачынстваў проці жыцьця. Засуджаным за палітычныя забойствы тэрмін зьняволеньня ў крэпасьці скарачаецца напалову з пераводам у астрог, а зьняволеньне ў крэпасьці на ўсё жыцьцё скарачаецца да 7 з паловаю гадоў зьняволеньня ў астрозе. Пададзены адначасна камуністычны праэкт амністыі палітычным вязьням камісія адхіліла. Камуністычны дэпутат Штэкер падкрэсьліваў, што з-за сацыял-дэмакратаў 20 палітычных, у тым ліку Макс Гельц, павінны яшчэ заставацца ў астрозе. Міністр юстыцыі Кох паведаміў, што працэс проці сяброў ЦК камуністычнай партыі 1923 г. не падпадзе пад амністыю, бо да гэтага часу не ўстаноўлена злачынства прыцягненых па гэтай справе да адказнасьці асоб. З гэтае прычыны некаторыя камуністычныя дэпутаты ранейшага рэйхстагу, пазбаўленыя дэпутацкай недатыкальнасьці, ня маюць і надалей ніякай магчымасьці займацца легальнай палітычнай дзейнасьцю.

НА ДАПАМОГУ НОБІЛЕ.

„КРАСІН“ ПАДАБРАЎ ГРУПУ МАЛЬГРЭМА

МАСКВА, 12-7. 12-га ліпеня а 12-й гадз. 30 хвіл. камітэт дапамогі «Італія» атрымаў ад прафэсара Самайловіча такую тэлеграму: «Маю шчасьце паведаміць, што 11 ліпеня а 6-й гадз. 40 хвіл. раніцы «Красін» падабраў двух удзельнікаў экспэдыцыі Нобіле—Цапі і Марыяні з групы Мальгрэма. Мальгрэм памёр на лёдзе месяц назад. Страціўшы сілы, ён ня мог рухацца далей. Італьянцы зьняты з невялікага таросу сярод дзікага плывучага лёду. Цапі і Марыяні 13 дзён нічога ня елі. Чухноўскі знашоў іх і даў «Красіну магчымасьць падабраць іх. Спачатку ўбачылі аднаго чалавека, які стаяў на лёдзіне, а зьтым другога, які ляжаў там. Марыяні адмарозіў нагу. Абодвы шчасьлівы і выказваюць удзячнасьць савецкай экспэдыцыі. «Красін» ідзе наперад у напрамку да групы Вільеры».

* * *

МАСКВА. Водлуг вестак камітэту дапамогі „Італіі“, „Красін“ а 14-й гадз. 11 ліпеня знаходзіўся на 80 град. 21 мін. паўночнай шырыні і 24 град. 10 мін. усходняй даўжыні. Ён пасоўваецца з хуткасьцю 4-х міль у гадзіну. Наперадзе лёдаколу чысты лёд. Такім чынам, магчымасьць руху наперад пакуль што забясьпечана. Як відаць, 12-га ліпеня раніцою «Красін» дасягне групы Мальгрэма, калі не спаткае на сваім шляху якіх-небудзь асаблівых перашкод.

Вялікае ўражананьне ад выратаваньня групы Мальгрэма.

МАСКВА, 12-7. У навуковых і авіяцыйных колах Масквы вестка аб тым, што „Красін“ падабраў групу Мальгрэма, была спаткана з вялікім задаволеньнем. Навуковыя колы лічаць, што гэты факт, апроч свайго вялічэзнага значэньня, поўнасьцю падцьвярджае плян выратаваньня экспэдыцыі Нобіле, распрацаваны савецкім камітэтам спачатку кампаніі, незалежна ад мерапрыёмстваў, намечаных з іншымі экспэдыцыямі.

Супрацоўніку ТАСС паведамілі ў аўтарытэтных колах, што «Красін» бясспрэчна дасягне групы Вільеры 13-га ліпеня. „Красін“ знаходзіцца на простым шляху за 40-45 кілёмэтраў ад гэтай групы.

ХТО ТАКІ МАЛЬГРЭМ.

ОСЛО, 11-7. Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Весткі, што савецкі лётнік Чухноўскі знашоў групу Мальгрэма, Марыяні і Сакі, спатканы ў Нарвэгіі з вялікаю радасьцю. Швэдзкі вучоны мэтэоролёг Мальгрэм добра вядомы ў Нарвэгіі сваім удзелам у экспэдыцыі Амундсэна на судне «Мод» і трансарктычным пералётам на дырыжаблі «Нарвэгія».

Вядомы дасьледца палярных краёў Свэрдруг у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што, па яго думцы, «Красін» можа выратаваць групу Мальгрэма, калі яна сапраўды знаходзіцца так блізка ад судна, як паведамлялася. Становішча групы Вільеры, па яго думцы, вельмі небясьпечнае.

САМАЛЁТ „УПЛЯНД“ НА ДАПАМОГУ МАЛЬГРЭМУ.

СТАКГОЛЬМ, 11-7. Швэдзкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «У зьвязку з паведамленьнем, што савецкі лётнік Чухноўскі знашоў групу Мальгрэма, швэдзкі вайсковы міністр тэлеграфва загадаў начальніку швэдзкай экспэдыцыі пакінуць на Шпіцбергене вялікі швэдзкі гідрасамалёт „Уплянд“, які павінен быў вакіравацца назад у Швэдыю».

У Саюзе ССР.

ДРУГІ „ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ“.

МАСКВА, 12-7. У адозьве ТДА-Авіяхіму СССР да ўсіх сяброў ТДА-Авіяхіму, да ўсіх працоўных СССР зазначана;

«Па ўсім СССР з 15-га да 22-га ліпеня праводзіцца другі „тыдзень абароны“. Летась працоўныя СССР далі належны адказ на пасяганьне ангельскіх імпэрыялістаў і яшчэ раз выказалі сваю цьвёрдую гатоўнасьць стаць на абарону адзінай у сьвеце дзяржавы пралетарыяту.

У выніку першага „тыдню абароны“ густою сеткаю раскінуліся вайсковыя і стралковыя гурткі ТДА-Авіяхіму. Але праца ўсіх гэтых шматлікіх арганізацый мае яшчэ значныя недахопы. У дні другога „тыдню абароны“ мы павінны ўзяць пад абстрал гэтыя недахопы і палепшыць якасьць працы ў галіне вайсковай падрыхтоўкі працоўных.

У выніку першага „тыдню абароны“ мы сабралі больш 10-ці міліёнаў рублёў у фонд узмацненьня тэхнічнай базы абароны „Наш адказ Чэмбэрлену“. У часе другога „тыдню абароны“ мы павінны забясьпечыць посьпех збораў у «фонд узмацненьня масавай працы ТДА-Авіяхіму». Гэты фонд дапаможа нам палепшыць якасьць вайсковай падрыхтоўкі працоўных і ўсёй масавай працы ТДА-Авіяхіму.

Праводзячы другі «тыдзень абароны», мы павінны памятаць, што лепшай гарантыяй міру зьяўляецца ўзмацненьне і рост сацыялістычнага будаўніцтва, магутная і баяздольная Чырвоная армія. Будзем усімі сіламі і сродкамі спрыяць індустрыялізацыі краю і сацыялістычнай перабудове вёскі. Будзем, як вока, берагчы баяздольнасьць нашай армії. Будзем усімі спосабамі ўзмацняць не магутнасьць. Абружым увагаю і любасьцю кожнага яе байца, кожную яе часьць.

Толькі пры пільнай увазе і ня спыненай гатоўнасьці да абароны мы на спужаемся ніякіх пагрозаў ворага. Толькі ў гэтым выпадку мы забясьпечым найбольшы посьпех сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР».

СПРАВА АБ ЭКАНАМІЧНЫМ ШПІЯНАЖЫ.

АБВІНАВАЧАНЫЯ НЯ ПРЫЗНАЮЦЦА Ў ШПІЯНАЖЫ.

МАСКВА. 11-га ліпеня ў вайсковай калегіі Вярхоўнага суду СССР распачаўся разгляд справы Акользіна і інш., абвінавачаных у эканамічным шпіянажы. Першы дзень працэсу абмяркоўвалася хадайніцтва абароны выклікаць дадатковых сьведак і далучыць да справы некаторыя дакументы. Прадстаўнік шведзкага акцыянэрнага таварыства «Сэпаратар» (Альфа Лаваль) Акользін, не адхіляючы абору і перадачы вестак замежным фірмам, вінаватым сябе ня прызнаў. Прадстаўнік шведзкай фірмы «Дыяболё Сэпаратар» Мацьвееў вінаватым сябе ня прызнаў, а весткі, якія ён перадаваў, ня лічыць сакрэтнымі. Памесьнік загадчыка сельска-гаспадарчым аддзелам тэхнічнай канторы дзяржаўнага гандлю Арлоў вінаватым сябе не прызнае, але не адхіляе, што меў часам гутаркі, якія часткова падцьвярджаюць пададзенае яму абвінавачаньне. Сябра праўленьня паўночна-краявой управы сельска-гаспадарчымі машынамі Бибякін, служачы фірмы «Сэпаратар» Пюпле, загадчык дастаўкаю малочнага інвэнтару саюзу «Дабрабыт» Бабій—вінаватымі сябе ня прызналі і лічаць, што ў перададзеных імі вестках нічога сакрэтнага ня было. Загадчык сельска-гаспадарчым аддзелам управы украінскага дзяржаўнага гандлю Пэўны вінаватым сябе ў перадачы сакрэтных вестак ня прызнаў, але прызнае, што гутарыў з Акользіным наконт заказаў. Загадчык дробным сельска-гаспадарчым інвэнтаром сельсаюзу Долін, спэцыяліст управы дзяржаўнага гандлю Беразьняк, інжынэр-машынавед «Сельскага Гаспадара» Барч і прадстаўнік Казакскага дзяржаўнага сельска-гаспадарчага складу Кальмянеў вінаватымі сябе ня прызналі. Беразьняк і Долін кажуць, што толькі інфармавалі Акользіна ў межах угавору в фірмаю.

За выкрыцьцё шахцінскай змовы.

РАСТОЎ-ДОН. Ад імя 20-ці тысяч капальнікаў Шахцінскага району, Шахцінскага акругкому горнарабочых аб'яднаная управы рудникамі, супрацоўніку АДПУ на Паўночным Каўказе Зонаву за актыўны і непасрэдны ўдзел у выкрыцьці шахцінскай контр-рэвалюцыйнай змовы перададзена грамата, а таксама званьне ганаровага забойшчыка.

Хто адказвае за Рудчанкоўскі выбух?

МАСКВА. Управа галоўнага горнага апалу паведаміла галоўканцэскому, што здаволеньне патрабаваньняў сем'яў рабочых, забітых пры выбуху на Рудчанкоўскай управе руднікамі, павінна быць усклядзена ў парадку заканадаўства на кансультуючую нямецкую фірму «Тысон», па віне якой здарыўся выбух. Да вырашэньня гэтага пытаньня ўправа Донвугалю загадала выплаціць сем'ям забітых розьніцу між дапамогаю з сапстраху і сярэдняй заработкам загінутых пры выбуху.

Выкрыты 22 млн. тон коксавага вугалю.

ЛЕНІНГРАД. Геолёгічны камітэт атрымаў паведамленьне, што на ўзьбярэжжы рэчкі Томі ў Камераўскім раёне выкрыты багатыя месторады коксавага вугалю, якія маюць блізка 22-х міліёнаў тон вугалю. Новы месторад мае асабліва важнае значэньне з прычыны блізкасьці яго да чыгункі.

На крымскіх курортах адноўлена 150 будынкаў

СІМФЭРОПАЛЬ. СНК Крыму заслухаў паведамленьне аб ходзе адноўленьня паўднёва-ўзьбярэжных курортаў. На адноўленьне курортаў асигнавана больш міліёну рублёў. Сёлетні плян адноўленьня ўжо выканан. Адноўлена 150 будынкаў. Распачата выкананьне пляну будучага году: рамонт пляжу Дульбэр у Місхоры, гатэлю «Расея» ў Яльце і інш. У сучасны момант на паўднёва-ўзьбярэжных курортах разгорнута больш 8.000 ложкаў.

Гураган каля Томску.

НОВАСІБІРСК. Каля Томску прайшоў нязвычайнай сілы гураган, які меў характар віхраслупу. Віхраслуп прайшоў над тайгою, пакінуўшы пасьля сябе прасеку ў 30 мэтраў шырынёю і некалькі кілёмэтраў даўжынёю. Віхраслуп павыдзіраў з каранём кедры, пашчапаў стогадовыя хвоі. Пры гэтым бліскала куляўідная маланка.

Падзеі ў Кітаі.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ АТРАДЫ Ў ХУНАНІ І ЦЬЗЯНФУ.

ШАНХАЙ, 11-7. Газэты паведамляюць, што ў Пінцыяні (правінцыя Хунань) і Цьзяньфу (правінцыя Цзянсі) зьявілися атрады на чале з камуністамі. Правінцыйная ўлада пасылае войска проці рэвалюцыйных атрадаў.

„АБ УЦІХАМІРАНЬНІ МАНЧЖУРЫІ.

ШАНХАЙ, 11-7. З Пекіну паведамляюць, што лідэры паўдзённаў даюць Чан-Кай-Шы поўную волю ў пытаньні «аб уціхамірваньні Манчжурыі».

Крытычнае становішча ў правінцыі Сычуань.

ШАНХАЙ, 11-7. Газэты паведамляюць, што становішча ў правінцыі Сычуань зараз крытычнае. У-Пэй-Фу згадзіўся заняць пасаду генэралісімуса і забясьпечыў сабе падтрыманьне некалькіх генэралаў у барацьбе проці нанкінскага ўраду. У Суйчуне распачаліся ваенныя апэрацыі.

Скасаваньне неспагнаных падаткаў.

ШАНХАЙ, 11-7. Нанкінскі ўрад абвясьціў аб скасаваньні ўсіх неспагнаных да 1-га студзеня вялмельных падаткаў.

МІРС У ТОКІЕ.

ТОКІЁ, 11-7. Сёньня в Мукдэну прыляцеў амэрыканскі самалёт «Сіты Кох Нью-Ёрк» з журналістам Мірсам, які робіць падарожжа навакол сьвету з мэтаю ўстанавіць новы рэкорд.

Абурэньне сярод бэльгійскіх шахцёраў.

Пагрозы праўленьня прафсаюзу.

ПАРЫЖ, 11-7. У Антвэрпене (Бэльгія) адбыліся сходы шахцёраў, арганізаваныя лідэрамі рэфармісцкіх прафсаюзаў. На ўсіх сходах выявілася вялікая апазіцыя проці прапаноў антвэрпэнскага губернатара Гальвэта, ухваленая праўленьнем прафсаюзаў.

Аднак, арганізатары сходаў нідзе не дапусьцілі галасаваньня і рашуча запратэставалі проці арганізацыі рэфэрэндуму. Праўленьне заявіла, што спыніць дапамогу бастуючым, калі яны не падпачаляцца пастанове. Памашканьне праўленьня ахоўваецца ўзмоцненым нарадам паліцыі, бо сярод бастуючых нагнетаецца вялікае абурэньне. Рэфармісты сьледам за буржуазным друкам прабуюць прыпісаць абурэньне рабочых упливу камуністычнай прапаганды.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

НАПЯРЭДАДНІ ЗРУХУ ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ ДАЧЫНЕНЬНЯЎ.

ВАРШАВА, 11-7. Газэта „Наш Пшэгляд“ паведамляе, што Пілсудзкага затрымліваюць у Варшаве замежна-палітычныя справы, у асобку, абвостраньне польска-літоўскіх дачыненьняў. Тая-ж газэта зазначае, што Пілсудзкі прыняў Патэка перад выездам яго ў Маскву і меў з ім доўгую гутарку. Як паведамляюць газэты, у выніку гэтай гутаркі «чакаецца эрух у польска-савецкіх дачыненьнях».

«ХЛОПСКА ПРАВДА» КАНФІСКАВАНА.

ВАРШАВА, 11-7. Паліцыя канфіскавала орган ППС для сялян «Хлопска Правда» за артыкул в заклікам да польскіх рабочых і сялян паўстаць проці ўраду, калі апошні гвалтоўва зьменіць канстытуцыю Польшчы.

БОЙ З ПАЛІЦЫЯЙ.

Гэтымі днямі ў мястэчку Баруны, Ашмян. пав. здарыўся факт рашучага адпору жыхароў у адносінах да паліцыі. На кірмашы паліцыянт арыштаваў нейкага В. Галецкага. Натоўп з 300 асоб не дазволіў узяць яго ў вучастак. Хутка зьявілася шмат паліцыі, якая арыштавала Галецкага. Тады натоўпы асадзіў вучастак. Камэндант вучастку даў каманду страляць. Ёсьць шмат параненых. 10 асоб арыштавана.

«РУСКІ НАРОДНЫ ДОМ».

„Віл. рускае т-ва“ пастанавіла прыступіць да ўтвараньня ў Вільні т. зв. „Рускага народнага дому“, у якім-бы мясьціліся-б усе філянтрапійныя, культурна-асьветныя і грамадзкія рускія арганізацыі ў Вільні.

ГАЛУЎКА ПРЫЕХАЎ У РЫГУ.

РЫГА, 11-7. Сюды прыехаў начальнік усходняга дэпартамэнту польскага міністэрства замежных спраў Галуўка.

ПЕРАМОГА КАМУНІСТАЎ У ЛЯНКАШЫРСКІМ САЮЗЕ.

ЛЁНДАН, 6-7. Інтэнсыўная барацьба між правым крылом і камуністамі ў Лянкашырскім саюзе гарнякоў скончылася рашучаю перамогаю камуністаў на выбарах службовых асоб. Старшынёю саюзу абран камуніст Эндру Мак-Анульты, які атрымаў 2.979 галасоў проці 2.504, пададзеных за іншых 3-х кандыдатаў правага крыла. Віцэ-старшынёю абран прыхільны да камуністаў Гентэр і генэральным сэкратаром—камуніст Адан.

У выканкоме саюзу, які складаецца з 12-ці сяброў, камуністы і спачуваючыя ім маюць абсалютную большасьць. У выбарах бралі ўдзел 51 мясцовых аддзяленьняў Лянкашырскага саюзу з 88-мі.

СПЫНЕНЬНЕ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ.

ЛЁНДАН. Наконт вынікаў 2-га пленарнага пасяджэньня канфэрэнцыі па пытаньні „аб міру ў прамысловасьці“ лібэральная „Дэйлі Ньюс“ піша, што ўхвалены на гэтым пасяджэньні даклад раўназначны „амаль што афіцыйнаму спыненьню клясавай барацьбы“. Прыблізна тое самае пішуць аб канфэрэнцыі і іншыя буржуазныя газэты.

Чэмбэрлен вітае прапанову Келёга.

ЛЁНДАН. 11-7. Адказваючы палаце вобшчын наконт ангельскага адказу на прапанову Келёга ўтварыць шматбаковы ўгавор, які забараняе вайну, як сродак нацыянальнай палітыкі, Чэмбэрлен заявіў: „Я цьвёрда спадзяюся, што мне ўдасца паслаць адказ на прапанову Келёга да сканчэньня парляманцкай сесіі. Я вітаю прапанову Келёга і буду спрыяць утварэньню прапанаванага Келёгам угавору.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

АРЫШТЫ Ў САФІІ.

ВЕНА. У зьвязку з агалошаньнем у баўгарскім друку рабочай партыі пратэсту проці забароны сходаў партыі, у Сафіі арыштаваны ўсе сябры сафійскага гарадзкога камітэту і некаторыя рацавыя сябры партыі.

АРЫШТЫ КАМУНІСТАЎ У ПАНЯВЕЖЫ.

Нядаўна літоўская палітычная паліцыя арыштавала ў Паняжэвы 15 асоб, якіх абвінавачаюць у камуністычнай агітацыі галоўным чынам сярод літоўскіх салдат. Арыштаваных адасклалі ў Коўню. Адзін з іх па дарозе в бег.

РАБОЧЫ РУХ У АНГЛІІ ЗНОЎ НА ЎЗДЫМЕ.

Глыбока цікавы, навучальны і поўны вялікага міжнароднага значэньня момант, перажываемы зараз ангельскім рабочым рухам.

У Англіі няма сялян. Гарадзкая дробная буржуазея параўнаўча малалікая. Буйная буржуазея і рабочая кляса знаходзяцца там тварам да твару. І ўсё сусьветнае панаваньне капіталістычнае Англіі са сваёй прыгнятальнай палітыкай, захопніцкімі імкненьнямі і супрацьсавецкімі плянамі ў выніку трымаецца выключна на палітычнай адсталасьці ангельскіх рабочых, на параўнаўчай слабасьці ангельскага рэвалюцыйнага руху.

Ня дзіва таму, што распачатае ў 1925-26 гадох рэвалюцыйнае абуджэньне ангельскае рабочае клясы і асабліва ўсеагульная забастоўка 1926 году выклікалі вялікую трывогу сярод ангельскае буржуазеі. Вельмі каштоўнай зьяўляецца тая паслуга, якую аказалі тады буржуазеі згодніцкія правадыры прафсаюзаў, сарваўшыя вялікую забастоўку.

Зрыў усеагульнае забастоўкі і наступны за ім зрыў гераічнае сямімесячнае барацьбы ангельскіх гарнякоў былі пачаткам паслабленьня рэвалюцыйнае хвалі. Іскра абурэньня яшчэ канчаткова не пагасла ў глыбіні рабочае масы. Але баявы настрой зьменшыўся. Актыўнасьць рабочых зьнізілася. Рабочыя арганізацыі, якім зрыў забастовачнага руху нанёс няшчадны ўдар, моцна паслабелі.

Прадпрыёмцы былі першыя, якія выкарысталі наступіўшае зацішша пасьля рэвалюцыйнае навальніцы 1926 году. Згоднікі былі другія. Прадпрыёмцы правялі закон, значна ўскладняючы чыннасьць прафсаюзаў. Згоднікі зрабілі яшчэ больш. Яны запрапанавалі капіталістам купіць у іх параўнаўча за недарагую цану плян поўнага і канчатковага выратаваньня ад забастовак і іншых рэвалюцыйных выступленьняў рабочае клясы.

Гэтак пачаліся і вядуцца яшчэ і цяпер перамовы аб славутным ад гэтага часу «міры ў прамысловасьці».

„Мір у прамысловасьці“—для Англіі роч, па сутнасьці, ня новая.

Яшчэ далёка да вайны ўжываліся захады ўстанавіць «мір» то ў аднэй, то ў другой галіне ангельскае прамысловасьці. У шмат якіх галінах былі заснаваны розныя камісіі, у якія ўваходзілі прадстаўнікі прадпрыёмцаў і прадстаўнікі прафсаюзаў і абавязкам якіх быў разгляд канфліктаў, узьнікаючых між прадпрыёмцамі і рабочымі.

У выпадку немагчымасьці вырашыць канфлікт у мясцовай камісіі, ён перадаваўся ў акруговую, з акруговае—у камісію вышэйшую для данае галіны вытворчасьці. І толькі тады, калі і ў вышэйшай камісіі не ўдавалася дамагчыся „мірнага“ вырашэньня канфлікту, рабочыя мелі права распачаць забастоўку, ці прадпрыёмцы—лёкаут (зачыненьне прадпрыёмстваў і масавае звальненьне рабочых).

Вось нешта накшталт такога парадку і хацелі-б устанавіць зараз згоднікі ва ўсёй ангельскай прамысловасьці.

Няцяжка зразумець, што ўсе гэтыя камісіі, дзе згодніцкія правадыры прафсаюзаў вялі-б пасяджэньні толькі з прадпрыёмцамі, канфлікты заўсёды вырашаліся-б у карысьць капіталістаў. А калі так, дык па сутнасьці ня было-б ніякага „міру ў прамысловасьці“.

Яшчэ да вайны лёндаўскі карэспандэнт расейскае газэты „Русские Ведомости“ зазначаў, што ангельскіе рабочыя «выказваюць незадаволеньне вынікамі чыннасьці прымірачых камэр (г. зн. памянёных розных камісій)». А да вайны-ж становішча рабочых у Англіі было шмат лепшым, чымся цяпер. Ясна, што цяпер адным незадаволеньнем справа ня можа абмежавацца. Ясна, што прапануемы згодніцкімі плян ня можа даць прадстаўнікам выратаваньня ад забастовак і рэвалюцыйных выступленьняў. Але затое доўгія зацяжкі забастовак для папярэдніх, хоць і заведама безнадзейных перамоў павінны палегчыць зрыў і здрадніцтва забастовачнае барацьбы.

Праўда, згоднікі робяць гэта і зараз, бяз усякага „міру ў прамысловасьці“. Але яны дамагаюцца арганізацыі сталага і без перапынку дзейнічаючага апарату згодніцтва рабочага руху. Вось у чым сэнс гутарак аб «прамысловым міры».

Разумеецца, арганізацыя колькі небудзь трывалага здрадніцкага апарату магчыма толькі цаною некаторых падачак некаторым невялікім верхавіным пластом рабочых. Вось цана, якую просяць згоднікі. Але яны, разумеецца, і тут гатовы на ўступкі.

Згоднікі, напалоханыя рэвалюцыйным 1926 годам ня менш, чымся самі капіталісты, сьпяшаюцца чаго-б ні каштавала ўмовіцца і аб'яднацца з буржуазеяй.

Макданальд, вядомы правадыр рабочае партыі (згодніцкае), у кожнай сваёй прамове, у кожным сваім артыкуле імкнецца даказаць, што ён такі-ж вораг рэвалюцыі, такі-ж вораг СССР, такі-ж імпэрыяліст і прыхільнік прыгнечаньня калёній, як і Чэмбэрлен. Рабочая партыя агалашае новую праграму, якая пічым не адрозьніваецца ад праграмы буржуазнае партыі-лібэралаў. Буржуазная газэта «Таймс» з насьмешкай раўнае гэтую праграму в крамкай, дзе пад „сацыялістычнай шыльдай“ прадаюцца „лібэральныя тавары“.

Мы, між іншым, ня згодны з «Таймсам». Няма нават ніякага сацыялістычнага шыльду. Згодніцкая праца вядзецца зусім адкрыта.

Вось гэта адсутнасьць і выклікае трывогу некаторых дзелчоў рабочае партыі—Кука, Мэкстона, Джорджа Хікса і іншых.

Справа ў тым, што ў глыбіні рабочых мас іскра абурэньня, запаленая 1926 годам, ня спыняе ператварацца ў полымя. Асабліва востра растуць настроі сярод гарнякоў. Вельмі цяжкія ўмовы працы, навязаныя ім пасьля зрыву забастоўкі 1926 году, пяўхільна растучае жабрацтва, яўная здрада згоднікаў,—усё гэта штырхае гарнякоў да камуністаў. Камуністы атрымліваюць шмат перамог на

Тэлеграма

Старшыні ЦВК т. Чарвякову і Старшыні СНК т. Галадзеду.

Рэвалюцыйны Ваенны Савет Беларускага Ваеннага Вокругу вітае рабочых і сялян БССР з 8-ай гадавінай вызваленьня БССР ад польскае акупацыі. Байцы Вокругу будуць і ўперад моцна і непарушна стаяць на варце граніцы, ахоўваць мір і працу Савецкае Беларусі.

Шырокае падтрыманьне, братэрскае спачуваньне і непарыўная сувязь рабочых і сялян Беларусі з Чырвонай арміяй—верная парука нашых посьпехаў.

Член Рэвваенсавету БВВ ЛАНДА.

Хто кіруе Францыяй.

(Лист з Парыжу).

Каля 200 францускіх дэпутатаў і сэнатараў зьяўляюцца членамі пагляднальных саветаў розных акцыянэрных таварыстваў. У гэтых адносінах француская «дэмакратыя» нічым не адрозьніваецца ад усіх іншых буржуазных дэмакратый. Усюды дэпутаты, міністры, праваднікі буржуазных партый зьяўляюцца толькі абаронцамі палітычных і эканамічных інтарэсаў розных капіталістычных груп. Гарацьба паміж рознымі буржуазнымі партыямі складаецца ў большасьці выпадкаў з барацьбы за панаваньне розных канцэрнаў (прамысловых аб'яднаньняў).

Аднак, падворныя формы панаваньня капіталу ў «дэмакратычнай» Францыі адрозьніваюцца вельмі значна ад іншых краін. У Францыі ў сутнасьці няма буржуазных партый. Толькі фашысцка-манархічная група «Аксыён Франсэз» і часткова радыкальна-сацыялістычная партыя маюць у Францыі нешта накшталт партыйных арганізацый. Усе іншыя буржуазныя групаваньні, між іншым тыя, якія граюць пэнер пануючую ролю, не яўляюць сабою сапраўдных партый з больш ці менш значным лікам членаў, з пэўным сьветапоглядам і з пэўнай праграмай, а зьяўляюцца толькі аб'яднаньнямі паасобных дэпутатаў і паасобных ініцыятараў, якія толькі ў парляманце выступаюць аб'яднана і да таго-ж стала зьмяняюцца і пераходзяць з аднае групы ў другую. Фракцыя, узьнікшая сёньня, заўтра ўжо падзяляецца, а пасьлязаўтра вусім зьнікае. Палітыка дэпутата зьмяняецца ў залежнасьці ад таго, чые інтарэсы яму трэба бараніць.

У самым парляманце задача дэпутата складаецца ня столькі з барацьбы за паўныя палітычныя ідэалы, сколькі з абароны камэрцыйных інтарэсаў свайго дабрадзея-фінансіста: ён стараецца атрымаць для яго заказы ад дзяржавы і розная роду канцэсіі, хлапоча аб падатках і мытных палягчаньнях, раздабывае добрыя пасады для сваякоў фінансіста і г. д.

Капіталістычная група, асабліва магутная, наймае адразу вялікую колькасьць дэпутатаў і аб'ядае іх у «палітычную фракцыю». Пры такім становішчы рэчаў зразумела, што ў францускім парляманце ёсьць асобная партыя мэталюргічнае прамысловасьці, спэцыяльная партыя банкаў, партыя электра-капіталу (Люшэр) і г. д.

Ня мала дэпутатаў парляманту і сэнатараў знаходзіцца на непасрэднай службе ў караля ваеннае прамысловасьці Шнэйдэр-Крэзо. Прыбыткі гэтага канцэрну залежаць цалком ад колькасьці заказаў, наступаючых ад ваеннага і марскога ведамства. І для Шнэйдэра асабліва важна, каб усе галоўныя пасады ў ваенным і марскім ведамстве былі ў руках яго агентаў. Калі Клемансо быў прэм'ер міністрам, яго брат працаваў у дырэкцыі заводаў Крэзо. Наступнік Клемансо Мільеран прапаваў як адвакат, бароначы інтарэсы Крэзо. Шнэйдэр-Крэзо мае сваіх агентаў і ў міністэрстве замежных спраў. Кожны новы саюзны дагавор Францыі з тэй ці іншай дзяржавай (з Польшчаю, Чэха-Славакіяй, Паўднёвай Славіяй і г. д.) зьвязан заўсёды з заказамі ваеннае амуніцыі фірме Шнэйдэр-Крэзо, і прадастаўленьнем ёй канцэсій (рудніку, пабудова ваенных партоў і чыгунак) у „прыязцельскай" дзяржаве.

Такім чынам, дышлёматыя, генэральны штаб і капітал ваеннае прамысловасьці ўтвараюць у Францыі непарыўны сьвяшчонны саюз, маючы на мэце: плянамерную падрыхтоўку вайны.

Шмат дэпутатаў састаіць на службе ў банках,—у першую чаргу ў абодвых буйнейшых францускіх фінансавых канцэрнах «Уніён Парыыён» і «Банк дэ Пары». У той час, як адзін з гэтых канцэрнаў бароніць дэпутатаў нацыянальнага блёку (Луі, Марэна і г. д.), другі з іх больш сымпатызуе „леваму блёку (Эрыё). Дэпутаты банкаўскае партыі працуюць у фінансавых камісіях францускае палаты і сэнату; на іх долю выпадае і партфэль міністра фінансаў. Задача гэтых дэпутатаў—сачыць, каб зьберажэньні, якія знаходзяцца пад кантролем дзяржавы, а таксама сродкі дзяржаўнага банку, падаткі і г. д. былі выкарыстаны ў інтарэсах буйных банкаў.

Банкі могуць скінуць любы нявыгодны для іх урад: ім даволі для гэтага прад'явіць для аплаты даўгавыя абавязацельствы дзяржавы, якія знаходзяцца ў іх руках і выклікаць такім чынам інфляцыю (выпуск папяровых грошай). Калі некалькі гадоў таму назад міністр фінансаў Каілё, які сам раней быў банкірам, адмовіўся даць «Банку дэ Пары» ролю «галоўнага кансультанта ўраду», ён быў скінуты ў працягу 24 гадзін. Яго наступнік Пуанкарэ выканаў патрабаваньне банку. «Банк дэ Пары» спыніў сваю кампанію і ўдзячны парлямант агаласіў Пуанкарэ „гэроем стабілізацыі".

Асобна трэба сказаць аб дзьвюх грандыёзных арганізацыях, якія адбіваюць у палітыцы агульна-капіталістычныя інтарэсы. Адна з іх называецца «Рэспубліканскі камітэт гандлю, прамысловасьці і сельскае гаспадаркі». Гэты „камітэт" фінансуе ўсе левыя буржуазныя групы, у першую чаргу, партыю Эрыё, г. зв. радыкальна-сацыялістычную партыю. Ваенны міністр Пэнлеве, міністр унутраных спраў Саро, міністр гандлю Бакановскі, міністр працы Люшэр, начальнік парыскае паліцыі Шыяр (вядомы сваім праследваньнем камуністаў) толькі агенты гэтага камітэту.

Другая група—«Аб'яднаньне эканамічных інтарэсаў» утрымлівае правыя фракцыі парляманту. Сродкі гэтаму камітэту даюцца сталёва-прамысловым трэстам і праваднікам лётарынгскае цяжкае індустрыі. Кожны кандыдат у члены парляманту, маючы падтрыманьне з выбарчых фондаў гэтага аб'яднаньня, дае пісьмовае абавязацельства бараніць яго інтарэсы і патрабаваньні гэтае арганізацыі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Рост саматужна-прамысловай каапэрацыі.

БАБРУЙСК. Саматужна-прамысловая каапэрацыя Бабруйшчыны расьце і мацнее. Аб гэтым сьведчыць ня толькі рост саміх аб'яднаньняў, але і наладжваньне іх працы, рост сабароў, рост вытворчасьці.

За час з 1-га кастрычніка 1927 году Бабруйшчына займала 24 новых саматужна-прамысловых арганізацыі. Цяпер лік гэтых арганізацый пераваліў за 80. У іх налічваецца 1280 саматужнікаў.

Аб якасным наладжваньні працы нашай саматужнай каапэрацыі сьведчыць хаця-б апошнае зьліяньне некаторых аднародных арцелей. Арцелі зразумелі, што пры згуртаваньні сваіх сіл і сродкаў яны, папершае, змогуць дасягнуць значнага павялічэньня вырабу прадукцыі, а падругое—змогуць паменшыць свае накладныя выдаткі, адсюль—зьніжэньне цэны на свае вырабы.

У апошнія часы саматужна-прамысловая каапэрацыя Бабруйшчыны зьвярнула значную ўвагу на каапэраваньне жанчын. Арганізавана некалькі белашвэйных арцелей, трыкатажная арцель і г. д. Ужо ў сучасны момант у саматужна-прамысловай каапэрацыі Бабруйшчыны налічваецца 11 проц. жанчын.

Колькасны рост, якасное палепшаньне, праведзеная рацыяналізацыя ў саматужнай каапэрацыі Бабруйшчыны дала практычныя і карысныя вынікі. Гэта як мага лепей паказвае лічба валавай прадукцыі арцелі і не рост у параўнаньні з мінулым паўгодзьдзем. Так, за першае паўгодзьдзе 1927-28 году саматужна-прамысловыя арцелі далі павялічэньне валавага кошту прадукцыі супроць папярэдняга паўгодзьдзя на 353 тысячы рублёў, а агульная сума гэтай валавай прадукцыі пераваліла за мілён рублёў.

Зразумела, што матар'яльнае ўзмацненьне саматужна-прамысловай каапэрацыі Бабруйшчыны дало магчымасьць павялічыць і аплату працы саміх саматужнікаў.

Раней збыт вырабу ў пераважнай большасьці праходзіў праз прыватніка, праз прыватны рынак. Цяпер саюзам саматужна-прамысловай каапэрацыі утворан шэраг умоў з мясцовымі каапэрацыйнымі арганізацыямі на збыт сваіх вырабаў.

За кошт фонду каапэраваньня беднаты каапэравана ў арцелі 110 бедняко, як'м выдадзена да 1500 рублёў грашовай дапамогі.

Так паступова расьце і шырыцца наша саматужна-прамысловая каапэрацыя, сваёй арганізацыяй выцісканючы прыватніка, арганізоўваючы саматужніка—бедняка.

А. Д.

Пачынаецца пабудова новага заводу с.-г. машын.

Гомель 12-7. Скончана падрыхтоўчая праца на пабудове новага заводу сельска-гаспадарчых машын. 15 ліпеня распачнецца праца па пабудове заводу. У гэтым 1928 годзе намечана пабудаваць 4 карпусы: дрэваапрацовачны, чыгуна-літны, мэханічны і загатоўчы.

Апроч таго, у гэтым будаўнічым сэзоне будуць пабудаваны фундаманты для астатніх карпусоў, каб у будучым годзе, ня трацячы часу, адразу распачаць працу. На тэрыторыі заводу будуць пабудаваны клюб і сталоўка. Завод будзе штогод пастаўляць на рынак 60 тысяч веялак, 40 тысяч саломарэзак, 8 тысяч конных прывадоў і 8 тысяч малацілак. На заводзе будзе занята 1500 рабочых. Працаваць завод будзе на дзьве зьмены па 7 гадзін. Пабудова заводу разьлічана на 3 гады.

Няшчасны выпадак на пабудове.

ГОМЕЛЬ, 12-7. Учора раніцой здарыўся няшчасны выпадак на пабудове на 1-м дзяржаўным млыку. З прычыны тэхнічнага недагляду на наладжваньні рыштаваньняў на пабудове, апошнія ад грузу абваліліся і прыдушылі 5 рабочых будаўнікоў і самога тэхніка.

Трое з пацярпеўшых былі цяжка пакалечаны. Усе пацярпеўшыя дастаўлены каратай хуткай дапамогі ў больніцу. На месца здарэньня выехалі прадстаўнікі інспэкцыі працы, саюзных органаў, і дасьледчых органаў. Робіцца дазнаньне ў тэрміновым парадку.

Звыш мілёна на кватэрнае будаўніцтва.

Гомель, 12-7. *Кватэрны каапэрацыйны саюз у 1929 годзе намячае выдаць на кватэрнае будаўніцтва 1 мілён 104 тысячы руб. З іх на каменнае будаўніцтва 550 тысяч р. Намечаны да пабудовы камяніцы на 160 кватэр у цэнтры гораду і ў рабочых пасёлках драўняныя дамы на 72 кватэры. У Новабеліцы будзе пабудована камяніца на 30 кватэр. Райсаветам адведзен вучастак зямлі для пабудовы дому. Апроч пабудовы новых дамоў у 1929 г. будзе скончана пабудова 112 кватэр пачатых у гэтым годзе.*

Новыя сельска-гаспадарчыя каапэратывы.

ГОМЕЛЬ, 12-7. Акрземаддзел праводзе працу па арганізацыі новых сельска-гаспадарчых каапэратываў. Намячаецца да 1 кастрычніка арганізаваць у акрузе 107 розных сельска-гаспадарчых каапэрацыйных ячэек.

Усеагульнае навучаньне.

Бабруйск, 12-7. *Прэзыдыум акрвыканкому разглядзеў пытаньне аб увядзеньні ўсеагульнага навучаньня ў акрузе. Па папярэдніх меркаваньнях усеагульнае навучаньне будзе праведзена ў 9 райёнах акругі, у якіх вызначаны 73 школьных вучасткі. На мясцох хутка распачнецца праца па падрыхтоўцы да правядзеньня ўсеагульнага навучаньня.*

Будаўніцтва за самаабкладаньне.

Крупкі, 12-VII. Па адным толькі мястэчку Крупкі сабрана па самаабкладаньню 2.200 рублёў. Для будаўніцтва па м. Крупкі адпушчана: на канчатковае абсталяваньне крупскай школы—500 р., на пабудову шапы—1000 рублёў, на адчыненьне дзіцячай пляцоўкі—100 руб., на пабудову студні, набыцьцё інвэнтару для пажарнай дружыны 600 рублёў.

Адчыненьне дзіцячых ясьляў і пляцовак.

Барысаў 12-7. Падрыхтоўчая праца да арганізацыі ясьляў і пляцовак пачалася ашчэ да Міжнароднага Дню Жанчын. Адчынены ясьлі ў вёсках Забашэвічах, Хаўхольцах і Бытчы. Для кожных ясьляў закуплены хатнія аптэчкі.

Адчынены пры трох савгасах і камуне дзіцячыя пляцоўкі. Адна пляцоўка адчынена за сродкі шэфаў. Дзьве пляцоўкі за сродкі каапэрацыі.

Вёска Зембін адчыніла адну пляцоўку за ўласныя сродкі.

70 прапаноў.

Гомель. 12-7. Кантрольная камісія пры мясцкоме галоўнага складу гаспадарча-матар'яльнага аддзелу Заходніх чыгунак за месяц унесла 70 прапаноў аб вынішчэньні недахопаў складзкой гаспадаркі. Камісія выкрыла вялікія ненармальнасьці ў галіне закупкі розных матар'ялаў. У працягу некалькіх год аддзелам закупляліся непатрэбныя матар'ялы і запасныя часткі. На складах іх накапілася на 103 тысячы руб.

Школьнае будаўніцтва.

Бабруйск, 12-7. Распачата падрыхтоўка будынкаў школ да новага навучальнага году. На рамонт школ гораду адпушчаецца 7500 рублёў. У райёне заводу «Чырвоны харчоўнік» будуецца новая 5-камплектавая школа. На пабудову яе адпушчана 20 тысяч рублёў.

Першым здаў падатак.

Горкі, 12-7. Першым здаў сельска-гаспадарчы падатак поўнасьцю за 1928-1929 г. у суме 16 р. 50 кап. гр-н в. Валынцава Горскага сельсавету Топаркоў Пятрок, які мае пасеву 3,4 дзесяц., сенажаці—1,8 дзес., кароў—2 коняй—2 і едакоў 5.

На ўзмацненьне масавай працы ТДА-Авіяхіму.

БАБРУЙСК, 12-7. Акруговы Савет ТДА-Авіяхіму распачаў збор сродкаў у фонд узмацненьня масавай працы таварыства. Збор сродкаў праходзіць праз выклікі ў газэце, па падпісных лістох і г. д.

Дасьледваньне рыбных вадаёмаў.

БАБРУЙСК, 12-7. У Бабруйск прыехала экспэдыцыя па дасьледваньню рыбных вадаёмаў пад кіраўніцтвам прафэсара Елівонскага. 13 ліпеня экспэдыцыя выяжджае на дасьледваньне ракі Бярозы. Праца па дасьледваньню рыбных вадаёмаў скончыцца ў пачатку жнівня.

Замацаваньне пяскоў.

Бабруйск, 12-7. Акруговы інспэктарыят асьветы вызначыў на прэміраваньне вёскі, якія праводзілі працу па замацаваньню пяскоў. За час вясны бягучага году замацавана сялянствам 554 гэктары пяскоў. Закладзена на пясчаных плошчах 7 хвойных гадавальнікаў і г. д.

Новы дом на 42 кватэры.

Бабруйск, 12-7. Жыльлёва-арэндае таварыства «Камуна» распачало пабудову вялікага трохпавярховага дому, разьлічанага на 42 кватэры. Дом будзе пабудован і абсталёван навейшымі тэхнічнымі прыстасаваньнямі. Гэты дом зьяўляецца другім вялікім домам у Бабруйску, бо адзін такі дом будуе акруговы жыльлёвы саюз.

ПАБУДОВА НОВАГА ДЭПО.

Гомель, 12-VII. Акрвыканкомдзелам асигнаваны 3 тысячы руб. на пабудову новага пажарнага дэпо ў Нова-Беліцы. У гэтым годзе будзе пабудован склад. У будучым годзе будзе пабудавана вежа і інтэрнат для пажарнікаў. У зьвязку з мэханізацыяй 1 пажарнай часьці ў Нова-Беліцы пераходзіць частка пажарнага інвэнтару.

РОСТ АШЧАДНАСЬЦІ.

Гомель, 12-VII. У касы ашчаднасьці за ліпень месяц уцягнута ў акрузе новых 1.133 ўкладчыкі. Першае месца па павялічэньні ліку ўкладчыкаў займае Веткаўская каса ашчаднасьці. Значна адстаюць Хойніцкая, Камарынская, Буда-Кашалёўская і Васілевіцкая касы ашчаднасьці.

Трэба пашырыць страхаваньне пасеваў ад градабіцьця.

Дзякуючы халоднаму надвор'ю, якое стаяла ў маі, чэрвені і першай дэкадзе ліпеня, выпадкі градабіцьця на тэрыторыі БССР за гэты перыяд былі, параўнальна з мінулым годам, нязначнымі. Калі летась на 1-е ліпеня было заяўлена насельніцтвам аб пасаваньні градам пасеваў у маі-чэрвені на плошчы звыш 60000 дзесяцін, дык за гэты-ж тэрмін у бягучым годзе паступіла заявак на плошчы ня больш 6500 дзесяцін.

Градабіцьці ў розных райёнах БССР прайшлі ў дні найбольшага нацяпленьня. Так, у маі адмечаны градавымі днямі 25, 26 і 27 і ў чэрвені—1, 15 і 25-е чэрвеня.

Найбольшае пасаваньне пасеваў назіралася на тэрыторыі Бабруйскай і Гомельскай округ—у Бабруйскім, Жлобінскім, Рагачэўскім і Буда-Кашалёўскім райёнах.

Тут град больш, чым у 50 вёсках амаль цалкам зьнішчыў пасевы азіміны. Пабітае градам жыта, якое да таго-ж папрэла зімою, прышлося перасяваць.

У іншых райёнах, дзе назіралася градабіцьце, пасевы градам ня так пасаваны і выпадкаў перасеву дзякуючы гэтаму, было вельмі мала.

Апрача граду ў некаторых райёнах БССР, як напрыклад, у Лепельскім, Бягомльскім, Плешчаніцкім і Барысаўскім, пасевы, галоўным чынам, яравыя, былі значна пасаваны і часткова наваты вымыты з глебы ліўнямі. У частцы гэтых райёнаў пацярпеўшыя гаспадаркі перасеялі тыя плошчы, дзе гэта было патрэбна, але разам з тым досыць значная частка пасаваных плошчаў засталася, дзякуючы адсутнасьці насеньне не перасеянай.

Бура 4 ліпеня, з ліўнем і навальніцай, мела пачатак у паўночнай Нямеччыне. Гэта бура захапіла частку тэрыторыі Польшчы, яна прайшла шырокай паласой і па тэрыторыі БССР. У нас бура прайшла з градам у Пухавіцкім, Чавускім, Крычаўскім, Расьненскім і Амсьціслаўскім райёнах і пасавала азімыя і яравыя пасевы больш чым у 30 вёсках на плошчы больш 3.500 дзесяцін. Інтэнсыўнасьць гэтага градабіцьця была досыць значная, і ў паасобных райёнах красуючае жыта пасавана амаль на ўсе 100 проц.

Пасаваныя майскім і чэрвеньскім градабіцьцямі пасевы ў большай частцы ўжо агледжаны і ацэнены камісіямі. Гаспадаркі, якія вымушаны былі, дзякуючы градабіцьцю, зрабіць перасевы пасаваных пасеваў, ужо атрымалі ад Дзяржстраху страхавую ўзнагароду.

Прыступлена ўжо да ацэнкі страт ад градабіцьця 4 ліпеня і першая дапамога нарэшце ўшаму сялянству ў выглядзе выплаты страхоўкі будзе дадзена Дзяржстрахам у бліжэйшыя дні.

Цёплыя дні ашчэ папраўдзе, час ашчэ ня ўйшоў і няхай кожны з сялян падумае аб тым, што неабходна застрахаваць свае пасевы ад градабіцьця. Страхаваць лепш калектыўна цэлай вёскай, або групамі ў 8—12 гаспадарак, бо тады даецца 10 проц. скідкі, альбо плацяжы можна ўносіць у 2-3 тэрміны.

Больш увагі першаму дзярж-конзаводу.

Рэальныя крокі праз будаўніцтва трактарзаводаў, абсталяваньне трактарных цэхаў прымае савецкі ўрад для пераводу сельска - гаспадарчай вытворчасьці на вышэйшую базу машыннай тэхнікі.

Ашчэ зусім нядаўна досыць «аўтарытэтна» і ашчэ больш кансэрватыўна разважалася—„трактар для Беларусі не падыходзіць". Аднак, гэта не пацьвердзілася, і трактарызацыя будзе ісьці ў адпаведнасьці з вырабам і з давозам іх у БССР ужо ў першую плянавую пяцігодку да паўтысячы штук. Аднак, як у справе калектывізацыі было-б вялікай палітыка-гаспадарчай памылкай не зварочваць увагі на індывідуальныя бядняцка-сераднякія гаспадаркі,—на разьвіцьцё іх вытворчых сіл ашчэ ў сваёй індывідуальнай форме.

Адну з найвялікшых роляй у палепшаньні конскага складу БССР адыгрывае палепшаньне якасьці каня. У справе палепшаньня сялянскіх коняй заклікан адыграць вялікую ролю першы дзяржаўны конскі завод, размешчаны ў гаспадарцы „Прудок" — на адлегласьці вярсты ад гораду Гомелю.

На заучных пунктах для сялянскіх кабыл у гэтым годзе было больш 20 жарабкоў, частка з якіх каштуе па некалькі тысяч.

Асаблівую цікавасьць выклікае праца па штучнаму абсэмяненьню. Пачалася гэта праца в 1924 году. Сярод «штучных бацькоў» сустракаем найлепшых вытворцаў, злучка з якімі раней каштавала ня менш 50 руб., а зараз усё гэта зусім дарэмна. Шмат гіроніі выклікала гэта мерапрыёмства ў першы год:

«Доктар замест жарабка — ад яго рук і будзе». І тое, што «было», што жарабяты былі падобны да бацькі, пераканала шмат каго: за 50, 100 вёрст прыяжджаюць за «штучнымі бацькамі».

Разгортваецца будаўніцтва, будуецца новая стайня, інадром.

Ёсьць і хібы. Завод трымаецца на індывідуальна - адміністрацыйным мэтадзе кіраваньня. Прафэсыянальная праца вядзецца слаба. Дрэнныя адносіны да заводу акаляючых вёсак. „Пан трымаў чаркесаў, а дзяржконзавод—міліцыянэраў», разважаюць сяляне, ня лічачыся з тым, што шкода пасьбай сялянскай жывёлы можа прынесьці заводу мілённыя страты.

Вёсцы не растлумачана ашчэ значэньне заводу, патрэбнасьць усёй завадзкой працы. Існаваньне заводу яна ацэньвае як «барскую зацею». Ні рабочы калектыў, ні кіраўніцтва не папрацавалі як трэба над гэтай неабходнасьцю.

Завод разьмешчан у гаспадарцы без патрэбнай плошчы выпасаў. Гэта трэба выправіць хоць бы праз мэліярацыю бліжэйшых лугавых масываў і пабудаваць там лепшыя стайні для матачнага аддзяленьня заводу.

Задачы палепшаньня конскага складу патрабуюць максымальнай увагі заводу ў напрамку пазбаўленьня яго працы ад усякага аматарства. Відавочны патрэбы павялічэньня бюджэту заводу ў 1928-29 г. як для пашырэньня заводу і правядзеньня жыльлёвага будаўніцтва для рабочых, так і ваталазарэту і валаправоду для конязаводу.

Патрэбна штогодняе прыкамандыраваньне на працу ў конязавод некалькіх асоб, скончыўшых с.-г. акадэмію, дзеля падрыхтоўкі вельмі патрэбных спэцыялістаў па коняводзтву. Т. А.

Ем. Яраслаўскі.

ШТУРМАН НАДЫХОДЗЯЧАЙ БУРЫ.

(ДА СОТАЙ ГАДАВІНЫ З ДНЮ НАРАДЖЭНЬНЯ М. Г. ЧАРНЫШЭЎСКАГА).

12-га ліпеня—сто гадоў ад дню нараджэньня аднаго з вялікіх мысьляцеляў і рэвалюцыянэраў — Мікалая Гаўрылавіча Чарнышэўскага. Значэньне яго ў гісторыі расейскага рэвалюцыйнага руху аграмаднае.

Уладзімір Ільліч, як і Карл Маркс вельмі высока ставілі Чарнышэўскага і адносіліся да яго з вялікаю пашанаю. Ленін у артыкуле аб Гэрцэне, напісаным у красавіку 1912 г., зазначаў на «тры пакаленьні», тры клясы, дзейнічаючыя ў расейскай рэвалюцыі. Вузкае кола гэтых рэвалюцыянэраў. Вельмі далёкі яны ад народу. Але іх справа не загінула. Дэкабрысты абудзілі Гэрцэна. Гэрцэн разгарнуў рэвалюцыйную агітацыю.

«Яе падхапілі, пашырылі, умацавалі, загартавалі рэвалюцыянэры-разначынцы, пачынаючы з Чарнышэўскага і канчаючы гэроямі «Народнае Волі». Пашырылася кола барацьбітоў, шчыльней іх сувязь з народам. „Маладыя штурманы будучае буры",—называў іх Гэрцэн. Але гэта ашчэ ня была самая бура.

„Бура—гэта рух саміх мас. Пралетарыят, адзіная да канца рэвалюцыйная кляса, узьнялася на чале іх у упарэдзе ўзбудзіла да адкрытае рэвалюцыйнае барацьбы міліёны сялян..." —пісаў т. Ленін.

Такім „маладым штурманам будучае буры" і быў М. Г. Чарнышэўскі, на літаратурных творах якога выхоўваліся тысячы рэвалюцыянэраў.

Ленін лічыў Чарнышэўскага выявіцелем дэмакратычнага руху мас. Спрэчкі, якія адбываліся ў 60-тых гадох між лібераламі і рэвалюцыянэрамі-разначынцамі, Ленін разглядаў як прадказаньне тае барацьбы, якая насьля адбывалася між кадэтамі лібераламі і рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам мас.

Ленін вельмі ўважліва вывучаў творы Чарнышэўскага і цаніў яго эканамічна працы, хоць і не падзяляў эканамічных поглядаў Чарнышэўскага.

У сваёй дасканалай кнізцы па філёзофіі «Матар'ялізм і эмпірыёкрытыцызм» Ленін спэцыяльна спыняецца на філёзофскіх поглядах Чарнышэўскага, на яго адносінах да матар'ялізму. Па думцы Леніна, «Чарнышэўскі—адзіны сапраўды вялікі расейскі пісьменьнік, які здолеў з 50-тых гадоў аж да 1888 году заставацца на ўзроўні філёзофскага матар'ялізму і адкінуць нікчэмную бязглуздасьць... блытанінку». Але, нажаль, „Чарнышэўскі ня здолеў, правільней ня мог з прычыны адсталасьці расейскага жыцьця ўзьняцца да дыялектычнага матар'ялізму Маркса і Энгельса».

Нараз Ленін успамінае яскравыя думкі Чарнышэўскага. У часе імпэрыялістычнае вайны ў артыкуле «Аб нацыянальнай гордасьці „вялікароса?" Ленін пісаў у сьнежні 1914 году:

«Мы памятаем, як паўвеку таму назад вялікарасейскі дэмакрат Чарнышэўскі, аддаючы сваё жыцьцё справе рэвалюцыі, сказаў: «Нікчэмная нацыя, нацыя нявольнікаў, зьверху да нізу—усе нявольнікі». Успамінаючы гэтыя словы Чарнышэўскага, Ленін дадае: «Шчырыя і двудушныя нявольнікі-вялікаросы (нявольнікі ў адносінах да царскае манархіі) ня любяць успамінаць аб гэтых словах. А па-нашаму, гэта былі словы, якія выказвалі сапраўдную любоў, сумуючую з прычыны адсутнасьці рэвалюцыйнасьці ў масах вялікароскага насельніцтва. Тады яе ня было. Цяпер яе мала, але яна ўжо ёсьць».

Далей, у артыкуле „Дзіцячая хвароба «лявізны» ў камунізьме" Ленін называе Чарнышэўскага „вялікі сацыяліст дамарксавага пэрыяду". Ён падае ў навучаньне левым камуністам словы Чарнышэўскага аб тым, што «палітычная чыннасьць—гэта ня гулянка па Неўскім праспэкце"—гэты сказ Леніна успамінаў кіраз у сваіх прамовах і артыкулах. У артыкуле «З мінулага рабочага друку ў Расеі» Ленін зноў падзяляе вызваленчы рух на тры пэрыяды: 1) пэрыяд шляхэцкі, прыкладна з 1825 па 1861 г., 2) разначынскі буржуазна - дэмакратычны,—прыблізна з 1861 па 1895 г. і 3) пралетарскі з 1895 году па сучасны момант.

Як-жа ацэньвае Ленін Чарнышэўскага? Раўнаючы Чарнышэўскага з Гэрцэнам, Ленін пісаў:

„Чарнышэўскі быў куды больш паступовым і баявым дэмакратам. Ад яго твораў вее духам клясавае барацьбы. Ён востра праводзіў тую лінію выкрываньняў і здрадаў лібералізму, якую і па сучасны момант ненавідзяць кадэты і ліквідатары».

Урэшце, у артыкуле «Аб значэньні вазлічнага матар'ялізму» Ленін адзначае як аднаго з заснавацеляў матар'ялістычнага вучэньня ў Расеі М. Г. Чарнышэўскага.

У тыя жудасныя гады.

Мікалай Гаўрылавіч Чарнышэўскі выйшаў на літаратурную арэну ў жудасныя мікалаеўскія гады. Напалоханы дэкабрыстамі, цар Мікалай I душыў усякую вольную думку. Справа даходзіла нават да таго, што ў кухарскіх кнігах выкрэсьлівалі словы „вольны дух", баючыся, каб ад гэтых слоў хто сапраўды не заразіўся духам волі. На лекцыях ва ўнівэрсытэтах, як пісаў Чарнышэўскі, спэцыяльныя агенты сачылі за кожным словам прафэсара. А ў Заходняй Эўропе незадоўга перад тым адбылася рэвалюцыя, абураючы, уздымаючы народныя масы супроць спрадвечных прыгнятальнікаў. Нібы падземны агонь праходзіў в аднэй краіны ў другую--на Аўстра-Вэнгрыі, Нямеччыне і Францыі, хісталючы троны, ламаючы рэшткі прыгоннага ладу.

Але ў Расеі навольніцтва было ашчэ моцнае. Міжнародным жандарам і „астрогам народаў" была Расея, пасылаючы сваё войска ўціхамірыць паўстаньне працоўных мас у Астра-Вэнгрыі, бо расейскія абшарнікі і цар баяліся, як бы «шалёны» год рэвалюцыі—1848 год—не паўтарыўся ў Расеі, і чым бурлівей уздымаліся хвалі рэвалюцыі на Захадзе, тым мацней душыў цар народ і народную думку.

Але як ні стараліся адмежаваць Расею ад Заходняй Эўропы, рух думкі, рух народных мас перадаваліся праз усе межы і кардоны. У той час у Заходняй Эўропе ў рэвалюцыйных колах панавалі ашчэ такія сацыялістычныя вучэньні, якія ў сваю аснову паклалі не барацьбу клясаў, а згоду гэтых клясаў на якім-небудзь вельмі добрым ідэальным пляне грамадзкага ўпарадкаваньня. Такія сацыялісты-утапісты, як Кобэ, Сэн-Сіман, Фур'е, Робэрт Оўэн, П'ер Леру і іншыя спадзяваліся на тое, што іх пляны перабудовы зразумеюць і ўхваляць, і прымуць ня толькі беднякі, але і багатыя, бо гэтыя пляны ідэальнай перабудовы грамады былі абгрунтаваны на пачатках розуму і справядлівасьці.

Гэтыя сацыялісты-утапісты разважалі, што розум і справядлівасьць уласьцівы і капіталістам. Думка, што «справядлівасьць у кожнай клясе асобная», ашчэ не ўладала гэтымі сацыялістамі так, як яна ўжо афармілася ў той час у вялікіх настаўнікаў навуковага сацыялізму—Маркса і Энгельса. Аднак, усёй сваёй крытыкай існуючага ладу сацыялісты варушылі думку і рэвалюцыйнае пачуцьцё працоўных клясаў, якіх жыцьцё штырхала на незамірымую клясавую барацьбу.

Чарнышэўскі, як і іншыя чулыя і рэвалюцыйна-настроеныя людзі таго часу, зачытваўся творамі францускіх сацыялістаў-утапістаў, асабліва Фур'е. Фур'е прывабна маляваў будучую чалавечую грамаду, дзе людзі, аб'яднаныя ў чыста эканамічныя саюзы ці фалангі, будуць жыць у прыгожых палацах-інтэрнатах-фаланстэрах, зрабіўшы працу, на падставе разумнай (рацыянальнай) арганізацыі яе, лёгкай і радаснай. Чарнышэўскі вельмі шмат працаваў над творамі гэтых першых сацыялістаў.

У маі 1848 году Чарнышэўскі пісаў у сваім дзеньніку: «Я нікольні не пашкадую жыцьця для перамогі сваіх перакананьняў, для перамогі волі, роўнасьці і братэрства, зьнішчэньня жабрацтва і ганьбы. Калі-б толькі я быў упэўнен, што перамогуць мае перакананьні, дык нават не пашкадаваў бы, што ня ўбачу дню перамогі і панаваньня іх. І памірацъ будзе прыемна...» Аднак, Чарнышэўскі не бяз крытыкі прымаў гэта вучэньне. Ён працаваў над тым, каб аздаровіць гэтыя вучэньні, зраблць іх бліжэйшымі да жыцьця, вызваліць іх ад утапічнага характару, знайсьці ім матар'яльную апору.

Са ўсіх філёзофскіх вучэньняў таго часу ён выбраў вучэньне Людвіга Фэйербаха, былога настаўніка Маркса і Энгельса. Уладаючы вялікімі ведамі ў галіне эканомікі, ён блізка падыйшоў да вучэньня навуковага сацыялізму, асабліва там, дзе Фэйербах спыніўся на пункце погляду матар'ялізму.

Два „нігілісты".

Сур'ёзную працу пісьменьніка М. Г. Чарнышэўскі пачаў з 1854 г., г. зн. на 26 годзе жыцьця, у часопісі «Современник». Няжка ў кароткім артыкуле, нават немагчыма разабраць і ацаніць усю зробленую такім буйным мысьліцелем працу. Ён працаваў дзень і ноч, працаваў хутка, наўпынна, пісаў па 16 друкаваных старонак у суткі. З той прычыны, што добрых літаратурных працаўнікоў ня было, ён сам пісаў аб усім. Сам аб сабе Чарнышэўскі гаварыў: «Я пішу госпска, доўга, часта няжыцьцёва... Мая адзіная вартасьць,—але важная, важней уменьня пісаць,—гэта тое, што я правільней іншых разумею рэчы».

З 1855—1863 г. літаратурная чынасьць Чарнышэўскага ня спынялася. Ён, разумеецца, няправы, калі кажа, што артыкулы напісаны кепска і нежыцьцёва. Нават такая сур'ёзная праца, як яго «Примечания к Милю», напісаны надзвычайна жыва і захапляюча. Ня будучы мастаком, ён, аднак, у «Прологе» і «Что делать», а таксама ў спрэчках з лібераламі напісаў проста захапляючыя старонкі. У сваіх артыкулах ён піша аб самых рознастайных пытаньнях. Няма ніводнай буйнай палітычнай падзеі, ніводнага буйнага грамадзкага пытаньня, аб якім ён ня выказваўся-б. Ня трэба забываць, што Чарнышэўскаму прыходзілася пісаць у вузкіх межах мікалаеўскай цэнзуры, шмат якіх прозьвішчаў нельга было называць. Чарнышэўскі навінен быў гаварыць інакаваньнямі, «хадзіць вакол», пісаць так, каб чытач мог дагадвацца праз радочкі, што хоча сказаць пісьменьнік. Вялікім майстрам у гэтых адносінах быў М. Г. Чарнышэўскі.

Бліжэйшым яго памоцнікам у гэтай чынасьці быў яго прыяцель Мікалай Аляксандравіч Дабралюбаў, да якога Чарнышэўскі выказваў вельмі гарачую любоў і лічыў яго на розуму нават вышэй за сябе. Ён бачыў, як разьвіваецца буйны талент і ахоўваў яго і клапаціўся аб ім. Яны абодвы і пісалі, галоўным чынам, у часоп

Праверка--самакрытыка--кантроль мас.

Трэба ўпарадкаваць распаўсюджваньне газэт і часопісяў.

У сучасны момант НК РСІ заканчвае працу па абсьледваньні рэдакцый газэт. Як адно з галоўных пытаньняў, распаўсюджваньне пэрыядычных выданьняў было вылучана асобным пытаньнем. Матар'ялы абсьледваньня справы экспэдыраваньня газэт далі магчымасьць высьветліць шэраг недахопаў, недарэчнасьцяй і паралелізму ў галіне гэтай справы.

Паралельныя апараты—лішнія зьвеньні ад выдавецтва да чытача.

У горадзе Менску па распаўсюджваньню пэрыядычных выданьняў існуюць: Беларускае Аддзяленьне Выдавецтваў «Известий» і «Правда», рэдакцыя «Зьвязда», канторы іншых выдавецтваў і Менская паштова-тэлеграфная Кантора. Беларускае Аддзяленьне «Известий» мае манапольнае права распаўсюджваньня цэнтральных газэт, праводзіць калектыўную падпіску, а пошта і іншыя выдавецтвы праводзяць толькі індывідуальную падпіску і «самацёк», а Аддзяленьне «Известия» мае свае філіялы ў Віцебску і Гомелі (разам з менскім апарат складаецца з 42 адзінак). У астатніх гарадох з гэтай справай спраўляецца паштовы апарат.

Паміж канторамі існуе хваравітая канкурэнцыя, якая толькі адбіваецца на чытачу, і, апрача таго, немэтазгодна трацицца грошы на ўтрыманьне апарату. Таксама апрацоўка заказаў каштуе шмат грошай. Прыклад—з Гомелю, Магілеву, Віцебску сьпісы на падпішчыкаў пасылаюцца ў Менск; іх тут апрацоўваюць (перанос на карашкі) і выконваюць заказ, а разноска выконваецца праз пошты.

Пагоня за процантамі адбіваецца на якасьці падпіскі.

Як пошта, так і Беларускае Аддзял. Выдавецтва «Известия», прысылаючы падпіску праз сваіх агэнтаў, не зьвяртаюць увагі па якасьць апрацоўкі картак, па якіх праводзіцца дастаўка газэт. Агэнтура, якая прымае падпіску ад аддзяленьня „Известия», утрымліваецца за кошт процантаў і больш зацікаўлена вярбоўкай, чым добранакласнай апрацоўкай заказу. У выніку ўзьнікаюць розныя непаразуменьні. Шмат скаргаў. Направільна апрацаваных картак па Беларускаму Аддзял. „Известия" было ў студзені 73, лютым—82, сакавіку—69. Усесаюзная нарада аддзяленьняў выдавецтва „Правда" ад 9-12 сакавіка г. г. падкрэсьліла „неабходнасьць задачы максымальнага пераходу на індывідуальнае абслугоўваньне чытачоў, бо яно ў большасьці ўзьнімае культурны ўзрост насельніцтва". Гэтага з боку Беларускага Аддз. „Известий» няма, бо яно пашырае калектыўную падпіску. Поруч з гэтым Аддз. „Изв." дае крэдыт, што адбіваецца на іншых экспэдыцыях. Гэта самае можа рабіць і пошта, але прыбытак пойдзе на пашырэньне тыражу пэрыядычных выданьняў і на паленшаньне становішча паштовага апарату з матар'яльнага боку

Хацелі пакінуць чытача без газэты.

У Магілеве паміж агэнтамі Аддзял. «Известий» і поштай былі спрэчкі—пошта рашыла выкінуць іх карткі.—«Вы, бачыце, 1 проц. атрымліваеце, нашу падпіску захапляеце, а мы разносім. Правадзіце самі ўсю працу». Але потым схамянуліся — «прычым тут чытач?»

Газэта дастаўляецца чытачу несваечасова.

Пошта мае свае вучасткі і разносіць праз сваіх газэтаносцаў газэты па гораду. Кантора „Зьвязда" мае таксама свае вучасткі. Пошта мае газэтаносцаў, «Зьвязда"—24. Як тыя, так, і другія іншы раз маюць перагрузку. Вучасткі вялікія і газэта дастаўляецца (бязумоўна, ня ўсім чытачам) каля 3-4 гадзіны дню. У такіх раёнах падпіска падае. Гэткі-ж малюнак і па гор. Гомелю. Тут ня прыходзіцца даводзіць немэтазгоднасьць існаваньня паралельных вучасткаў, бо кожнаму відавочна, што лепш мець больш вучасткаў і атрымліваць своечасова газэту, не пазьней 12—1 г. дню.

Што-ж будзе рабіць газэтаносец у астатні час?

Пытаньне ставіцца верна. Ён будзе зьбіраць падпіску на пэрыядычныя выданьні на свайму маленькаму раёну, які ён будзе добра ведаць, і яго падпісчыкі таксама. Калі газэтаносец будзе добра ведаць свой раён, дык ён ужо хутчэй дастаўляць газэту, бо ня прыдзецца марнаваць часу па невядомых завулках.

Даходзіць да сьмешнага.

Бываюць выпадкі, калі не пасьпеў вечыніць дзьверы адзін газэтаносец, як услед за ім бяжыць другі, а потым пісьманосец, альбо яшчэ хто-небудзь з жабракоў. Бязумоўна, тут на галаву газэтчыка сыплецца ўсё—і лаянка, і „не хачу газэт, вы памарозілі дзяцей" і г. д. Не пасьпелі яны выйсьці, як тут ужо два агэнты.

Няўжо нельга зрабіць так, каб гэтага ня было?

Бывае і так: цёмны калідор, направа і налева кватэры. Першы газэтчык не застаў чытача, стараецца ўсё-ж такі пакінуць газэту—ціхае ж пад дзьверы; а другі, ня бачыўшы яго, падае праз яго... паднімаецца сам і зьбірае раскіданыя свае газэты... Адчыняе дзьверы ў суседні пакой, адкуль вылятае пісьманосец—тут іхныя лбы паспрабавалі адзін другога.

Так заўважалі газэтаносцы на экапомпарадах.

Гарсавет не клапоціца аб хуткай дастаўцы газэт.

Адсутнасьць на дамох адпаведных табліц, нямых даведак, наліччa адналіменных вуліц, асабліва бязыменных завулкаў, адпаведнай нумарацыі дамоў і кватэр (дарэчы сказаць—і сабак без намордніку і не на цепках) і г. д.—усё гэта перашкаджае хуткасьці дастаўкі газэт. Новы газэтаносец зьвярнуў у рэдакцыю 65 газэт «Рабочий».

Адсутнасьць скрыняў і прарэзаў у дзьвярох з надпісам „для газэт і лістоў" затрымлівае працу газэтаносца. Капеечная справа, а непаразуменьняў на рубель. Газэтаносцу прыходзіцца стукаць, гакаць, пакуль хто адчыніць. Бываюць выпадкі, калі газэтаносец пакідае газэту ў суседа, але той ня прымае... Калі-ж газэтаносец сам адчыніце дзьверы, то ўсьлед чуе «някультурны, хам» і г. д. Бязумоўна, чытачы дапамогуць самі сабе і зробяць скрынкі альбо прарэзы.

Газэты выходзяць са спазьненьнем.

Як агульнае зьявішча, менскія газэты выходзяць са спазьненьнем. Ад гэтага як адпраўка па чыгунцы, так і своечасовая дастаўка па гораду затрымліваецца, што прыводзіць да лішніх страт рэдакцый, якія прыходзіцца выплачваць за звышчасовую працу.

Розьнічны продаж газэт пастаўлены дрэнна.

На ст. Магілеў нельга атрымаць беларускай газэты, як і на іншых станцыях БССР, за малым выключэньнем. Здавальняюча пастаўлены продаж у розьніцу па гарадох: Менску, Гомелі, Віцебску, а ў астатніх—кепска, асабліва ў адносінах менскіх газэт. Тлумачыцца гэта тым, што выдавецтвы мала зьвяртаюць увагі на гэта, слаба і са спазьненьнем забясьпечваюць газэтай дамы адпачынку і лягеры.

Газэта, горад і вёска.

Горад добра забясьпечан газэтай, а калі зьвярнуцца да вёскі, дык нагул газэта пранікае слаба. Галоўным агэнтам, распаўсюджвацелем, газэтаносцам і лістаносцам на вёсцы зьяўляецца кальцавік, але апошні выкалачвае ў месяц 15-17 рублёў. Працы з імі па распаўсюджваньню пэрыядычных выданьняў ніхто не праводзіць. Каб ім даць частку проц. ад падпіскі, дык газэта ў вёску пойдзе лепш.

Ёсьць выпадкі, калі кальцавікі і добра прадаюць сялянскую газэту. Толькі пры адзінай экспэдыцыі можна скарыстаць гэту сілу, якая абслугоўвае жывою сувязью 75 проц. насельніцтва. Былі выпадкі, калі інструктары цэнтральных газэт (менскіх), будучы на раёнах, на пошту не заходзілі, у той час, калі начальнікі паштовых аддзяленьняў добра ведаюць свой раён і маюць вучот ліку газэт і чытачоў.

У мястэчку Уваравічах начальнік пошты на настаўніцкім сходзе даваў лічбы аб зьмяншэньні падпіскі і заклікаў настаўнікаў весьці працу па распаўсюджваньню пэрыядычных выданьняў.

Сувязь выдавецтваў з поштамі кепская; газэтныя пытаньні слаба асьвятляюцца ў мясцовым друку. Не праводзіўся ў нас конкурс на лепшага распаўсюджвацеля кальцавіка, пошту, сельсавет, школу і інш. за выключэньнем «Сав. Беларусі», якая правяла конкурс на лепшы МК працасьветы. Ёсьць прыклады, калі школы добра распаўсюджвалі „Бел. Бёску" і атрымалі потым прэмію. Трэба павялічыць пэнсію зборшчыкам падпіскі, шляхам адлічэньня ў іх карысьць проц., якія даўгэтуль атрымлівала пошта. Трэба сродкі накіраваць па верным, здаровым шляху замест існаваньня паралельных апаратаў, якія стварацоць хваравітую канкурэнцыю.

Пастанова НК РСІ.

У асноўным пастановы НК РСІ па гэтым пытаньні зводзяцца да наступнага:

1. Аб'яднаньне экспэдыцый, якое павінна прайсьці арганізавана, каб не адбілася на чытачу і тыражы.
2. Узмацненьне паштовага апарату кваліфікаванымі працаўнікамі па газэтнай справе.
3. Мець на чале экспэдыцыі вопытнага па газэтнай справе працаўніка.
4. Падняць кваліфікацыю па распаўсюджваньні пэрыядычных выданьняў сярод газэтаносцаў.
5. Аб'яднаць разноску выключна пры паштовай экспэдыцыі.
6. Разьбіць гарады на меншыя вучасткі.
7. Загадчык экспэдыцыі павінен мець цесную сувязь з рэдакцыямі, а таксама з праўленьнямі чыгунак у мэтах ажыцьцяўленьня дастаўкі пэрыяд. выданьняў без усялякіх перабояў.
8. У зьвязку з тым, што аб'яднаньне экспэдыцый часткова залежыць ад цэнтральных выдавецтваў, паставіць гэта пытаньне ў НК РСІ СССР і інш.

А. МІКАЛАЕЎ.

„Контр-р-рэ-эвалюцыя"...

У м. Крупках, райённым цэнтры, начальнік міліцыі—нехта Троцкі западозрыў настаўніцу Канякоўдаву ў контр-рэвалюцыі.

А справа пачалася з глупства...

— У адзін з звычайных веснавых дзён у мясцовым кіно ішла звычайная кіно-карціна аб «Славном старом времени», дзе галоўным гэроем фігураваў жандар з вялікімі, казацкімі вусамі. Як на няшчасьце—вусы ў жандара былі поўны адымак вусоў Троцкага. А калі так, дык кожны, хто бачыў вусы жандараў—міжвольна думаў: «а вусы ў Троцкага якраз, як у жандара»... Амаль кожны так думаў, але прама Троцкаму ніхто не рашыўся сказаць.

Пасьля карціны Троцкі з сябрам РВК — Сініцыным варочаўся дамоў. Сустрэлі гэту самую настаўніцу Канякоўдаву з таварышкай, якія вялі гутарку аб толькі што прагледжаным кінофільме.

Калі гутарка дайшла да выступленьня жандара ў фільме—настаўніцы засьміяліся і зрабілі параўнаньне вусоў жандара з вусамі начальніка міліцыі—Троцкага.

Да тонкага слуху Троцкага даляцелі жарты настаўніц і ён закіпеў ад злосьці.

— Гэта контр-р-рэвалюцыя... абражэньне асобы... палітычнае абражэньне...

А назаўтра Троцкі дае загад старэйшаму міліцыянэру вытварыць дазнаньне в настаўніцы, завесьці крымінальную справу.

Абвінавачаную вялі в працы, прывялі ў міліцыю (ня ведаю—закаваную ў канданы, ці так) і прачытаўшы ёй артыкул крымінальнага кодэксу—пачалі допыт.

Скончыўшы допыт—справа была перададзена нарсьледчаму для заключэньня.

Сьледчы, ведаючы, што за параўнаньне вусоў людзі не караюцца, сказаў, што справу трэба спыніць, але начміл. настаіваў на сваім. Патрабавалася дапамога райкому партыі, каб спыніць гэту справу.

У заключэньне мы можам сказаць, што вусы ў Троцкага запраўды доўгія, але наконт розуму—ня ўпэўнены.

Р.

„Рука руку мые".

Дзе можна знайсьці такія даверлівыя і бескантрольныя справы, як у канторах Белдзяржгандлю. На месцы загадчыкі самі спэцы, самі бухгальтары, самі скарбнікі з грашыма ў кішэні і вытвараюць, дзякуючы гэтаму, такія агіднасьці беспакаранна ў сваіх дзеяньнях.

Вось узорчык у Горацкай канторы Белдзяржгандлю, дзе зьяўляецца загадчыкам вядомы сваімі прадзелкамі Мазо, у якога вельмі цёмнае мінулае, зьвязанае з працаю яго ў Бабры, за што ён папаў пад суд і быў звольнен з працы, але яго прыцель Шоліханаў перацягнуў яго паціху на працу ў Горкі, дзе ён сябе вельмі добра адчувае. За час працы ў Белдзяржгандлі Мазо няраз за зносіны в прыватнікамі, за зрыў лімітных цэн трапіў пад сьледзтва, але калі матар'ял пападаў да Шустова, да сабутыльніка Мазо, далей справа не пасоўвалася.

Прызнаваемае на пасяджэньні РВК злачынства самім-жа Шустовым потым ператваралася ў пусты гук і на гэтым справа спынялася.

Так ішло больш двух гадоў. Дзе-ж справядлівасьць? Дзе-ж справа гэтага году на Мазо за яго ўчынкі, аб якіх гавораць шырокія грамадзкія колы. Тут, як відаць, вінаваты скуркі шаўро, якімі Мазо пасьпяшыў забясьпечыць сьледчага Шустова, упаўнаважанага ДПУ Кацава і інш. супольнікаў. Яна прыкрываецца яшчэ як віцаць добрасуседзкімі адносінамі Мазо з памоцнікам пракурора Розэнтаўзонам, які бачыць у чыннасьці сьледчага Шустова люстру рэвалюцыйнае законнасьці і салідарызуецца з яго дзеньнямі.

Яшчэ бясспрэчны факт, што Мазо да гэтага часу прыкрывае ў сябе па працы Шэвялёва, вядомага па Горацкім раёне спэкулянта, два браты якога знаходзяцца ў астрозе. Гэты Шэвялёў знаходзіцца пад судом за зрыў цэн, за спэкуляцыю, якую ён учыняў, будучы на працы ў Ленінскім таварыстве, адкуль і быў звольнен. Але цікава тое, што справа, якая знаходзіцца ў Горацкім судзе усё адкладаецца на новыя дні, ня гледзячы на яе яснасьць. Сьледчы Шустоў—дасканала ведаючы аб гэтым злачынстве, ніякіх мер да звальненьня Мазо з працы ня прымае і ня думае прымаць. Таксама маўчаць і пракурор і ўпаўнаважаны ДПУ т. Кацаў. Ёсьць яшчэ шмат злачынных дзеяньняў за Мазо, якія ня могуць быць ліквідаваны грамадзкай думкай, тым больш на грамадзкую думку, накіраваную да Мазо, ні сьледчы, ні пракурор не зварочваюць ніякае ўвагі, а патрэбна рэвізія аўтарытэтных і аб'ектыўных асоб. **«Селькор»**

На барацьбу з мэдыцынскімі шкоднікамі

Мэдыцынская дапамога па даму застрахаваным у выпадках цяжкай раптоўнай хваробы ў нас з кожным годам паляпшаецца.

Але разам з тым мы досыць часта чуем нараканьні на гэты від дапамогі, —кажуць «пакуль дачакаешся ўрача, дык дзесяць разоў памерці можна».

Сапраўды бываюць выпадкі, калі ўрач да хворага прыяжджае праз дзень а часамі і пазьней.

Вось аб тых умовах, якія выклікаюць гэтыя спазьненьні прыезда ўрача, мы і зьбіраемся пагутарыць.

Выяжджаючы для аказаньня дапамогі на даму, урач атрымоўвае цэлую кучу адрасоў, але часта ўрач заміж хворага застае кватэру на замку.

Напрыклад, 30 чэрвеня прыяжджае ўрач па выкліку гр. Іасялеўскага—Гандлёвая вуліца дом № 14, пытаецца, —дзе тут жыве патрэбны яму хворы...

Калі ласка,—вось у гэтай кватэры, паказваюць суседзі, але на кватэры вісіць вялікі замок і ня толькі хворага, але і здаровых нікога няма.

Ды яны, тавары доктар, з пару гадзін як пайшлі ў гарадзкі сад,—папярэджвае суседка ўрача.

Едзе ўрач на Садовую вуліцу дом № 44 да гр. Галубніна,—выклікалі да двух хворых дзяцей.

Вось тут жывуць Галубніны, паказвае ўрачу нейкі хлапчук кватэру хворых. Уваходзіць урач у памяшканьне і пытаецца,—дзе хворыя дзеці?

Ды... ды... яны... ды іх дома няма...

Зноў ўрачу прыходзіцца траціць дарэмна час і едзе далей.

Гр-ка Сільванова выклікала ўрача да 3-хгадавога дзіцяці. Прыяжджае ўрач і прама да маткі,—ну паказвайце вашага хворага...

Зараз, зараз, пайду яго паклічу. Аказваецца «хворае» дзіця бегае разам з іншымі дзецьмі на двары.

Зразумела, урач абураецца такімі адносінамі да яго цяжкай працы. Абураемся таксама і мы. Трэба нашым прафорганам падумаць аб тым, каб павесьці сярод сяброў саюзу тлумачальную працу аб тэй шкодзе, якую прыносяць гэткія «хворыя» сапраўды патрабуючым тэрміновай дапамогі ўрача

А з «хворымі» трэба агульнымі сіламі павесьці барацьбу, бо яны зьяўляюцца тымі шкоднікамі, з-за якіх вы часам лаеце страхкасу і ўрача, з-за якіх часам вы перажываеце толькі цяжкіх хвілін.

В. З—ў.

НА НОВАЙ ЗЯМЛІ—НОВЫЯ ЛЮДЗІ.

Направа балота, хмызьняк, налева—чорны, бы сажа, папар, а проста перад вачыма—лес.

Пасёлак выплыў з лесу, атросься ад касматых ёлак і моху, прысеў на шырокіх гонях...

Роўнай лініяй выцягнулася вуліца, агароджана шчытным парканам.

Крыху гісторыі.

Накурана ў хаце. За посьцілкай дыму не разгледзіш твараў. Перада мною, за сталом, сядзіць дзед Самсон.

Дзед Самсон! Колькі чуў я легендарных апавяданьняў аб ім!...

Вось шахта «Чорнае сэрца»—Данбас. Самсон шахцёр. Рэвалюцыя 1905 г. Забастоўка. Самсон гарыць... Ён у першых рабочых радох. А потым здрада...Арышты... Самсон за кратамі... Праз некалькі тыдняў—вызваленьне. Забарона наступаць на працу. Самсон едзе ў вёску. Пастуская пуга на некалькі год моцна прывязала да беднасьці і голаду.

З надыходам рэвалюцыі—Самсон павесялеў. Арганізацыя камбедаў, разьмеркаваньне панскай зямлі сярод беднаты—справа Самсона. Беднята загаманіла аб землеўпарадкаваньні. Выбіраюць Самсона ўпаўнаважаным. Сварка, пагроза забойствам, але, урэшце, Самсон даводзе вёску да землеўпарадкаваньня. Ствараецца пасёлак з шасьці гаспадароў. У адзнаку сваёй пашаны да Самсона Быкава—сяляне называюць пасёлак «Самсонава».

Самсон апавядае.

— Цяжка было, таварыш, цяжка... Ну што мы выскачалі з вёскі—голь... У Міхася, у Нупрэя, у Хведара па «божай каравёнцы», ды па п'яным каняку...Куды ня кінь—дык клін...

— А ты-ж ведаеш, якая наша зямля: гліна, балота, ды журавінны мох... «Жыві—ня тужы, памрэш не заплачуць»...Думалі—гадалі, як узяць жыцьцё за рабры...Ні так—ні гэтак.

Але скажу па праўдзе: Андрэй дапамог. Кажа—паклічам аграпома... Паклікаць, дык паклікаць. Мы бачылі, што зарэчанцы даўно ўжо разьбілі сваё поле на шматпольле. Давайце і мы так зробім. Вясной у дваццаць пятым годзе перайшлі на дзеваціпалёвы севазварот.

«Золата на балоце».

— Золата на балоце,—сказаў наш аграном.

Давай мы брацца за гэта золата. Паверыш, як цяжка выкапваць «золата з балота»!.. Як бугай працуеш... Пот у тры ручьі льле...

Рукі млеюць, у гразі ўвесь, але што да гэтага?.. На балоце золата і трэба яго дастаць!

— Дастанем!—адказалі ўсе.

Торф ляжыць усё лета на паветры, а восеньню раськідаецца па пахаці—пад жыта. Які-ж застаецца зімаваць, то ідзе пад ярыну. Калі падкінеш да торфу палову гною—не палюбавацца на жыта...Расцалуй яго, ды толькі!

На пасёлку маецца каля дваццаці балот і балотцаў. Усе іх асушаем. Правялі адну галоўную канаву праз усё поле і безьліч дапаможных. Парэзалі ўсё поле. Ідзе які-небудзь «махавік» (гэтак самсонаўцы называюць кулакоў) паглядзіць, ды праз зубы працэдзіць:

— Дай злыдні зямлю, дык яна яе пасьпе.

Лубін—мужычая расьліна.

— Ой, лубін, лубін гэты—расцаляваць яго—у адзін голас заяўляюць самсонаўцы.

— Гэта наша мужычая расьліна.

— Пасеяў я на лубіну жыта, —кажа сямідзесяцігадовы дзед Нупрэй. Ну, думаў, братцы, жыта будзе, як жыта. Ажно, братцы, як зарадзіла, дык і па гною такога ня было! І тады я сказаў сваім самсонаўцам: «Сейце, хлопцы, лубін, ячменю скажыце „бывай", а за лубін трымайцеся

«Балотнае золата» ды лубін дапамаглі самсонаўцам пакінуць галадуху. Сёлета ў самсонаўцаў шмат засеяна лубіну дзесяцін пяць на шэсьць двароў.

Торфам насьцелем, лубінам прыкрыем, гноем прытрусім і пачне радзіць мацівямля... А не захоча—дык змусім.

Раніцай.

Як толькі сонца паказала першыя праменьні ў вакно—іду з Андрэем на агароды. Першае, што кідаецца ў вочы на агародах,—маладыя дрэўцы, яблыні, ігрушы і інш.

— Нашы пасялкоўцы пачынаюць разводзіць сады,—кажа радасна Андрэй. Вось бачыш там, у канцы гародаў, ля дарогі квітнеюць дрэвы—гэта майго дзеда Нупрэя.

— Паглядзі—там і дзед.

Падыходзім да дзеда Нупрэя.

— Дрэўцы аглядаеце, дзед?—пытае Андрэй.

— Ага, ага, дрэўцы... Мошка нейкая навалілася на лісьце, дык я апырскваю бардоскай вадой. Дзед крыху памаўчаў і прадаўжаў.

—У вёсцы нельга было займацца садоўніцтвам, месца ня было. А вось тут, на пасёлку—шыр, прастор... У мяне ёсьць дрэў сорак, у Самсона дрэў трыццаць, ды і ў кожнага па дзесятку, па два набяроцца. Праз пяць год у нас садавіны будзе, братцы, ой!... Дзе там пасьсці!.. Антонаўку будзем на кірмаш адпраўляць, а яе ў нас больш шасьць. Але трэба яшчэ завесьці групавы сад, пасёлкаўцы аб гэтым думаюць.

У самсонавай хаце.

Ад дзеда Нупрэя, старога і практыканцкага садоўніка—ідзем да Самсона. Шырокі, новы двор. Усюды прыкмецен парадак. Хата пяцісьценка, новая. А ў сярэдзіне замест абразоў—партрэт Леніна.

— Ой, гора было з гэтымі абразамі,—скардзіцца Самсон. У мінулым годзе пасварыліся з бабай, дык яна мне і кажа:

— Зьніму Леніна. .Міколу пастаўлю...

З гэтымі славамі падыходзіць да партрэту.

— Ну зьнімі, зьнімі ўжо,—кажу я.

Зьняла такі, Міколу павесіла. Нічога не сказаў я. А вечарам прыходжу даму, гляджу: партрэт Леніна вісіць...

— Хто павесіў—пытаюся.

— Я, адказвае жонка.

— Хто цябе змусіў?

— Саша... Прывыкла да Леніна... Ён зямлю нам даў, а Мікола—што нам?

«І на сьвіньні не прагарым».

Так сказаў мне Самсон.

А справа ў тым, што самсонаўцы зацікавіліся сьвінаводзтвам. У кожнага ёсьць якое небудзь парасё на продаж.

— Адпусьціш пудоў пятнаццаць аўса, гэта каштуе рублёў дваццаць, не пашкадуеш працы, ну дык і прадасі вяпрука за паўсотню, а то і больш рублёў. «Мышанят» мы ня трымаем, яніякай карысьці ад іх, вось ёркшыр—гэта другая справа. Чыстакроўных ёркшыраў у нас няма: мешанцы. Мешанцы, па нашаму, паваг лепш: ні холаду, ні сіверу не баяцца.

«Хата для жывёлы».

Гэта не хлявы, а нешта схожае з хатамі. Дзесьці нават бачыў такія хаты. Самае галоўнае—сьвет. У хлявох відна, хоць газэту чытай. На зіму хлявы ўцяпляюцца.

— Зімой,—кажа Самсон, — спаць можна ў хляве. Падсьцілкі ў нас, звычайна, хапае.

Салома, мох, торф, шыгальё з лесу,—вось якая падсьцілка ў самсонаўцаў.

Жывёла корміцца з кармушак, зробленых па манер дацкіх.

— А ў суседзяй як? пытаюся я.

— У суседзяй-аднавяскоўцаў ніколі не хапае падсьцілкі, жывёла ў гразі, холад у пунях. Звычайна вясною раскрываюць стрэхі. У другіх падсьцілка з сена. Кінуў у куток сена і пашоў... Тут табе і яда і падсьцілка.

«Вучыцца хочу»..

Ужо некалькі год самсонаўцы выпісваюць газэты. Зімой рэгулярна займаецца сельска-гаспадарчы гурток.

— Вучыцца хочу!—Заяўляе шасьцідзесяцігадовы Самсон.—Летась я быў на акруговым зьезьдзе саветаў у Воршы. Прызнацца,—палову не зразумеў аб чым там казалі... вучыцца, вучыцца трэба.

Сын Самсона — Фядось, кандыдат партыі кіруе ўсёй культпрацай. Калі ёсьць час—Андрэй (сэкратар камсамольскай ячэйкі) дапамагае.

— Прачытаем што небудзь, а потым давай спрачацца... Але, урэшце, згаджаемся ўсе.

У суслаўскай хаце-чытальні ўзялі бібліятэчку па сельскай гаспэдарцы. Выпісваюць кніжкі з «Крестьянской газеты» і часопісі «Новая Деревня».

Будзем у калектыве.

— Але, паверыш, цяжкавата,—кажа Самсон—мы яшчэ працуем у раздроб, малоцім цапамі, сеем уручную, пашам плугам...

Жыцьцё, праўда, паляпшаецца: замест шасьцёх коняй на вёсцы—маем дзевяць на пасёлку. Замест самі кароў—чатырнаццаць. Але цяжкавата. Паленшаньне ідзе павольна. Мы зараз абмяркоўваем пытаньне аб набыцьці малатарні, сеялкі і пружыновай бараны. Гэтыя агульныя машыны дапамогуць нам аб'яднацца ў калектыў.

— Я хачу памерці ў калектыве, хачу ўбачыць новае, квітнеючае жыцьцё на калісьці пусьцеўшых гонях.

Будзем у калектыве!

Цім. Зарэчны.

Пас. Самсонава, Суслаўскі сельсавет, Дрыбінскі раён, Аршаншчына.

Кепскае становішча рабочых на торфараспрацоўках.

Барысаў. На торфараспрацоўках налічваецца звыш 150 рабочых, больш усяго прыежджыя. Умовы іх працы вельмі кепскія, а загадчык з прапановамі рабочых зусім ня хоча лічыцца. Вось факты. Кашалі для носкі сухога торфу дужа высокія, надрываюць рукі работніцам. Калі апошнія зьвярнуліся да загадчыка каб зьмяніў кашалі—ён адказаў:

Гэта ня наша справа, якія прысланы, у гэтакіх і працуйце.

Адносіны загадчыка да работніц дрэнныя, работніцы хоць і маюць скаргі на непарадкі, але баяцца зьвярнуцца да «загадчыка, памешчыка,» які нярэдка адказвае: „хочаце працаваць, дык працуйце, а не то каціцеся"...

«Маты» ў загадчыка на першым пляне. Рабочыя працуюць па 13-15 гадзін у суткі. Пры кожным балоце, дзе праводзяцца торфараспрацоўкі, заўсёды будуюць сушылку, для асушкі вопраткі парцянак і г. д. А тут рабочыя сушаць вопратку ў жылых памяшканьнях, ад чаго разводзіцца хвароба. Некаторыя рабочыя ад макраты хварэюць нагамі. На кухні няма дроў, адміністрацыя не дае. Няма памяшканьня для мыцьця бялізны. Прыходзіцца цягаць халодную ваду і мыць пад адкрытым небам.

Культпрацы не вядзецца ніякай. Няма лікпункту. Можна ўбачыць, як работніцы паабедаўшы, выцягваюць з-за пазухі абразы і моляцца. Нядаўна арганізован сэзонны дэлегацкі сход, але жанчыны, якія абраны ў дэлегацкі сход, ня ведаюць сваіх абавязкаў, бадай ня ведаюць, што гэта за дэлегацкі сход.

Рабочыя зарабляюць добра, але атрыманыя грошы прыходзіцца цягаць з сабой на працу (няма дзе схаваць), ці пушчаюць на непатрэбныя пакупкі. У кааперэтыве ніколі ня знойдзеш якой небудзь мануфактуры.

Усе пералічаныя недахопы павінны быць ліквідаваны. Належным установам трэба зьвярнуць увагу на памешчыцкія адносіны загадчыка да жанчын

Неабходна таксама адчыніць пры торфараспрацоўках касу ашчаднасьці, ці высылаць агэнта ў час атрыманьня пэнсіі для вярбоўкі ўкладчыкаў, бо гэтакіх знойдуцца вельмі многа.

Ял. Станкевіч.

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ*).

Пры старанным садзейнічаньні спэцыяльнай камісіі, створанай Кіеўскім Акругкомам ЛКСМУ для сустрэчы нашай экскурсіі, мы ў той-жа дзень аглядалі музэі г. Кіеву.

Багатае гістарычнае мінулае г. Кіеву ператварыла амаль увесь горад у вялічэзны музэй. Кожны рог вуліцы, кожная мясцовасьць, кожны пляц—мае сваю гісторыю...

Пачываючы помнікамі X стагодзьдзя—царквою Спаса, вядомым Сафійскім саборам — працы візантыйскіх майстроў, канчаючы помнікамі вялікага Кастрыншіка—Арсэналам,—з яго пакалечанымі сьценамі—усё гэта хавае Кіеў...

У Кіеўскім Гістарычным Музэі мы бачылі надзвычайна каштоўныя помнікі каменнага, бронзавага вякоў, помнікі так мала дасьледаванай трыпольскай культуры, якія сустракаюцца ў невялікім ліку і ў нас на Беларусі, пры археолёгічных раскопках... Калекцыі фаянсу XIX ст. вырабу Міжгорскай фаянсавай фабрыкі зьвярнулі нашу ўвагу прыгожай арнамэнцікай... Вітрыны з рушнікамі Тараса Рыгоравіча Шэўчэнкі, яго карціны, калекцыі украінскіх кілімаў, калекцыі слуцкіх паясоў, выстаўка твораў украінскага графіка-мастака Парбута, яго прыгожыя малюнкі сілуэтам, кашуля Тараса, заля з экспанатамі эпохі славян, перанесеныя ў музэй магілы скіфаў,—усе рэчы казалі нам пра даўным даўно мінулыя дні... Колькі працы пакладзена мясцовымі краязнаўцамі, каб стварыць такі багаты музэйны фонд...

А рэчы паглядаюць на нас з дубовых вітрын у нямым маўчаньні... Пра-

(*Глядзі «С. Б.» № 159*).

сторныя залі музэю, паважае прыемны халадок, і ня хочацца выходзіць з гэтага Харому Культуры...

Часу мала. Мы сьпяшаемся ў былы палац, пабудаваны архітэктарам Растрэлі па загаду імпэратрыцы Элізаветы Пятроўны для свайго палюбоўніка Разумоўскага... Прыяжджаем.

—Так! Элізавета Пятроўна добра клапацілася аб жыцьці сваіх палюбоўнікаў...

Даўным-даўно ня жывуць у гэтым палацу паны, даўным-даўно ня бачаць сьцены палацу баляў у гонар прыезду імпэратараў усерасійскіх...

Кажучы проста—у наш час усе гэтыя палацы як нельга лепш сталіся патрэбнымі для культурных устаноў. У палацу Разумоўскага разьмясьціўся вялічэзны музэй сельскай гаспадаркі лесастэпу і палесься Украіны... Вязьлічныя экспанаты, вынікі дасьледаў дасьледчых станцый, на свайму характару працы вельмі блізкіх да нашых сельска-гаспадарчых станцый. Я ня ведаю, ці скарыстоўваюцца вынікі дасьледаў украінскіх сельска-гаспадарчых станцый нашымі дасьледчыкамі, нашым Дасьледчым Інстытутам Лясной і Сельскай Гаспадаркі. Сувязь і абмен вопытам трэба абавязкова наладзіць, бо тое, што мы бачылі ў Кіеўскім музэі сельскай гаспадаркі, тыя вынікі яго лябараторнай працы, пра якія мы пачулі ад загадчыка музэю—кажуць, што музэй і яго навуковыя працаўнікі робяць вялікую справу.

Цяпер, у сувязі з будаўніцтвам Дняпрэльстану, дасьледчыя станцыі праводзяць досьледы над вырашчваньнем хлапку на Кіеўшчыне. І досьледы далі станоўчыя вынікі. Мы бачылі атрыманы добраякасны хлапок з палёў Кіеўшчыны...

Таксама праводзяцца досьледы над табачнымі плянтацыямі, па садоўніцтву, гародніцтву... нават над лубінам...

Мала-па-малу, сьпярша ў дасьледчых лябараторыях, у музэях, сярод навуковых працаўнікоў нараджаецца думка аб прывіцы той ці іншай культуры, а потым памаленьку выносіцца ў масы, і там робіцца ўпчэпы культурнай расьліны, жывёліны, якая дае ў стокраць большы прыбытак, чым тая дзікая, малапрыбытковая...

— Хутчэй-бы, хутчэй-бы ўсё карыснае для ўздыму нашай сельскай гаспадаркі вынесьці за сьцены надзвычайна прыгожых, карысных музэяў!

———

На вечар мы спазьніліся.

Вечар, прысьвечаны трохгодзьдзю украінізацыі кіеўскай газэты „Пролетарська Правда" стаўся вечарам, прысьвечаным дасягненьням украінскай савецкай культуры.

Тэатр імя Т. Р. Шэўчэнкі перапоўнены працоўнай інтэлігенцыяй, рабочымі. Усе слухаюць прамову рэдактара „Пролетарськой Правды" і культурнага дзеяча—Шчупака. Але ён спакойна кажа аб этапах працы газэты, аб яе задачах.

Углядаюся ў твар старэнькага вучонага, акадэміка Карчак-Чанурко-ўскага, які ня гледзячы на свой стары век, відаць не адстае ад сёньняшніх бурлівых дзён—уважліва слухае прамову...

Заля напружана слухае...

Вялікі калектыў—злучаны аднэй думкай, аднэй задачай—тварыць, дапамагаць тварыць новую культуру!

Замест паасобных аматараў-краязнаўцаў—Украінская Акадэмія Навук. Замест аматараў-акторaў—Украінскія Акадэмічныя Тэатры, з 300.000-мі рабочых гледачоў у 1927-28 тэатральным годзе па аднаму г. Кіеву.

Украінская Дзяржаўная Опэра.

Нязьлічны лік украінскіх газэт і часопісяў.

350 маладых асьпірантаў-дасьледчыкаў па аднаму г. Кіеву,—будучых украінскіх вучоных.

Буйны росквіт украінскага друкаванага слова. Тысячы кніжок, сотні тысяч друкаваных аркушаў.

Адраджэньне мастацтва.

Дзесяткі тысяч школ з выкладаньнем на роднай украінскай мове.

Пра усё гэта мы пачулі на гэтым вечары.

Пачынаем разумець цябе сёньняшняя Украіна!

І пачулі мы на вечары пра другое, пачулі пра ўпартую барацьбу. Пра барацьбу з новай буржуазіяй, з шавінізмам, з абыватальшчынай у культуры, пачулі пра барацьбу за украінскую пралетарскую культуру, пралетарскае мастацтва, пралетарскую літаратуру.

Зразумелі, што аудыторыя—за барацьбу.

І стала яшчэ больш радасна!..

———

Нечакана для нас прагучэла з-за стала прэзыдыуму прывітаньне ад імя прэзыдыуму і аудыторы

НЕНАРМАЛЬНАСЬЦІ Ў БУДАЎНІЦТВЕ НА ДОБРУСКАЙ ФАБРЫЦЫ.

Адсутнічае самакрытыка і кантроль з боку рабочых.

Учора на пасяджэньні Калегіі НК РСІ разглядаліся матар'ялы абсьледаваньня будаўніцтва на Добрускай фабрыцы.

З інфармацыі т. **Лазоўскага** відаць было, што пераабсталяваньне на фабрыцы пачалося в 1924 году. Хоць фармальна Палесбумтрэст і ўліўся ў бумтрэст, але яшчэ да гэтага часу **існуе два бумтрэсты**, і такім чынам, будаўніцтва на фабрыцы праводзілася самастойна. Усёй працай па будаўніцтву кіруе інжынэр Лісковіч, які ў маі г. г. паехаў заграніцу і яшчэ да гэтага часу не вярнуўся, ня гледзячы на тое, што тэрмін яго камандыроўкі ўжо скончыўся. Будаўніцтва на фабрыцы праводзіцца без генэральнага пляну; усе пляны інжынэр Лісковіч трымае ў сваёй галаве.

Спачатку будаўніцтва было разьлічана на 2 в лішнім мільёны, а ў выніку перакладаньня праэктаў і плянаў разьмер будаўніцтва дайшоў да 5 мільёнаў рублёў.

Гэты факт ясна сьведчыць аб бясплянавасьці і наўлічэньні ўсіх запатрабаваньняў у будаўніцтве.

У ходзе самога будаўніцтва назіраецца цэлы шэраг недахопаў. Так, напрыклад, будавалі памяшканьне для ўстаноўкі машын, ня ведаючы якога разьмеру будуць машыны, і ў выніку атрымалася тое, што прышлося перарабляць машыну, каб памясьціць яе ў гэтым памяшканьні. Апрача гэтага, шмат рабілі такіх заказаў заграніцай, якія можна было зрабіць у СССР; па ўсяму СССР шукаюць катлоў.

На ўсю гэту бесталкоўшчыну ў будаўніцтве траціцца шмат грошай.

Узаемаадносіны паміж адміністрацыяй і рабочымі кепскія. Усё робіцца моўчкі, бяз ведама рабочых.

Калі фабком хацеў заслухаць даклад інжынэра Лісковіча, дык некалькі раз прышлося хадзіць у габінэт і кланяцца перад Лісковічам. Тады Лісковіч сказаў так:

— Даклад я зраблю, але толькі папрашу не рабіць да мяне ніякіх запытаньняў і нічога не гаварыць у спрэчках. Так ён і зрабіў на пасяджэньні фабкому.

Вось гэта «прыкладная» самакрытыка.

У выніку такога галавацяпства трэст і адміністрацыя страцілі перад рабочымі свой аўтарытэт, таму, што яны ўсё будаўніцтва хацелі схаваць ад рабочых.

ВСНГ і бумтрэст лічылі, што лепшага інжынэра, як Лісковіч няма нідзе, а гэты «добры» інжынэр тры месяцы разьяжджае па Эўропе, і ў сваёй галаве трымае ўсе пляны і праэкты.

Як відаць, будаўніцтва атрымала поўную «аўтаномію», нават вытворча-тэхнічны аддзел бумтрэсту адмовіўся ад усякага кіраваньня будаўніцтвам.

У спрэчках па гэтым пытаньні выступіла каля 15 чал., у гэтым ліку выступалі рабочыя і інжынэры.

Выступіўшы ў спрэчках Нарком РСІ т. **Калнін** адзначыў ненармальнасьці ў папярэдняй пабудове памяшканьняў для тых машын, якіх разьмер невядомы. Далей т. Калнін гаворыць, што пляны павінны быць не ў галаве Лісковіча, а на паперы, з добрай праверкай і тлумачэньнем перад шырокімі рабочымі масамі. Таксама зьяўляецца ненармальным і тое, што інжынэр Лісковіч ужо трэці раз паехаў заграніцу, а будаўніцтву мала аддае ўвагі.

Таксама в спрэчак высьветлілася, што дырэктар трэсту Якубсон выступаў на сходзе супроць правільнай заметкі ў друку.

Калегія НК РСІ для канчатковай апрацоўкі рэзалюцыі і прыняцьця належных мер вылучыла спэцыяльную камісію. З.

ХТО ВІНАВАТ?

Дабруская ф-ка „Гэрой Працы".

За 8 вёрст ад Добрушу знаходзіцца балота, плошчаю ў дзесяткі квадратовых вёрст. Яшчэ 2 гады таму назад заняліся тэхнічным абсьледаваньнем прыгоднасьці данага балота, для здабычы торфу і гэтым самым забясьпечыць папяровую фабрыку апалам на дзесяткі гадоў, замяніўшы больш дарагі апал, як каменны вугаль, на танны.

Пасьля праведзенага дасьледаваньня —сапраўды—балота аказалася каштоўным, бо мела вялікі запас і добрае якасьці торфу. У 1927 г. пачалася падрыхтоўчая праца па арганізацыі і пабудове торфзаводу, а ў 1928 г. шырокім размахам распачалася пабудова. На торфараспрацоўках павінна быць занята звыш тысячы рабочых і служачых. У мэтах адшуканьня кваліфікаваных рабочых, заводзкае кіраўніцтва камандыравала ўпаўнаважаных у Бранскую губэрню і ў пачатку мая рабочыя прыбылі на месца працы. У выніку—прыехаўшыя рабочыя тарфянікі засталіся ні в чым, а ўласна:

Пачатае будаўніцтва вялося і вядзецца бяз плянаў і несвоечасова; памяшканьняў-баракаў пабудавана не ў дастатковай колькасьці, в дошак як гаворыцца «на цёплых нітках». У кепскае надвор'е няма дзе абагрэцца, прытоўшым з працы, што вельмі дрэнна адбіваецца на здароў'і рабочых.

Каштарыс на будаўніцтва торфазаводу трэстам зьменшан напалову.

Машыны для выпрацоўкі торфу ня былі своечасова дастаўлены і разьмеркаваны на месцы працы, што выявілася ў вялікіх нерацыянальных выдатках і прагулах арцеляў да 1000 рабочых. А па арцельнаму дагавору, кожнаму рабочаму за якую-небудзь працу, не даючую выпрацоўкі прадукцыі—гані 3 руб. у дзень кожнаму, і так паўтара-два тыдні.

Усіх машын на балоце лічыцца 8 шт., з іх працуюць 4-5 і то з перабоямі, бо даволі кепска стаіць справа з рабочымі мэханічнага цэху. Няма ніводнага добрага сьлёсара, а камандыраваны чорнарабочым з мэханічнае майстэрні, якія там лічацца найлепшымі майстрамі. Мэханік, які маецца на заводзе, ня мае магчымасьці абслужыць усе машыны, праводзіць рамонты і інш.

Усё гэта разам узятае гаворыць аб нядбайных і няўважлівых адносінах адміністрацыі вышэйстаячых арганізацый. Бо за два гады будаўніцтва на торфараспрацоўкі ніводзін раз не заглянуў ні трэст, ні яшчэ хто-небудзь на тое балота, якое праз некаторы час будзе перапрацавана ў золата, в тым разьлікам, каб хутчэй даць магчымасьць атрымаць танны і добры апал для пуцілаўца Беларусі.

БЫТАВЫЯ УМОВЫ.

Умовы вельмы дрэнныя, зусім адсутнічае лазьня, сталоўка, каморка для хаваньня харчоў, няма студняў і вады для піцьця, антысанітарны стан баракаў, мэдпункт таксама адсутнічае, да выключэньнем маленькае аптэчкі, якой загадвае рахункавод заводу, ёнжа фэльчар, чалавек зусім не кампэтэнтны, якому тэхнічнае працы хоць адбаўляй, а ён робіць перавязкі рабочым, выдае мэдыкаменты і г. д. У выпадку занядужаньня рабочыя і служачыя прымушаны ісьці пешшу за 8 вёрст у Добруш у больніцу, лазьню і інш. па балоту, а былі выпадкі, што, вяртаючыся з больніцы, два хворыя паваліліся на дарозе, ня маючы магчымасьці дайсьці да сваіх баракаў і выпадкова ехаўшыя прадстаўнікі парткалектыву падняялі гэтых рабочых хворых на малярыю, і давезьлі іх да баракаў. Ды ці варта пералічваць падобныя зьявішчы, якія з вялікаю цяжкасьцю прышлося-б апісваць. А вось падам ніжэй маленькі акт, праведзенага абсьледаваньня дабрускае больніцы бытавых умоў торфараспрацовак.

1. Адсутнасьць мэдпункту, мэддапамога аказваецца некампэтэнтнымі асобамі і мэты не дасягае.

2. Інтэрнат рабочых торфараспрацовак утрымліваецца ў антысанітарным стане, што абумоўліваецца недастатковай колькасьцю ўборшчыц.

3. Адсутнасьць лазьні, в прычыны чаго паявілася вашывасьць.

4. Няма студняў, што прымушае ўжываць недобраякасную ваду, гатаваную вада зусім адсутнічае.

5. Няма сталоўкі, пральні, няма скрынак для сьмецьця, няма каморкі для харчоў, якія хаваюцца ў бараках і хутка псуюцца.

6. Адсутнасьць адпаведнага спэцыяльнага абутку вельмі дрэнна адбіваецца на здароў'і рабочых, якія амаль увесь час працуюць у вадзе, абутак, які выдаецца (бахілы) не дасягае сваёй мэты, бо брэзент не прасмолены і непрагуманы, а жанчынам зусім не даюць.

7. Няма сушылак для адзеньня і спэц. абутку, з якое прычыны прыходзіцца надзяваць адзеньне ў мокрым выглядзе.

Усё вышэйпададзенае патрабуе неадкладнае рэалізацыі, бо шкоднасьць працы і санітарна-гігіенічныя недахопы вельмі дрэнна ўплываюць на працу рабочых і ў вострай форме падрываюць іх здароў'е, а занядужаньне малярыяй і скурнымі хваробамі вялікае.

ДАСТАЎКА ПРАДУКТАЎ.

У арцельным дагаворы, па месцы яго падпісаньня, устаўлена абавязацельства аб дастаўцы адміністрацыяй прадуктаў усіх выглядаў, неабходных рабочым, па цане ЦРК і добраякасных. Даную місію ўзяло на сябе дабрускае ЦРК. І што-ж мы бачым: засолена сотні пудоў мяса, а салаціна аказалася недобраякаснай, вельмі худая, нават не рассячы сякерай і з няпрыемным пахам. Хлеб аказаўся з тараканамі і сыры, а да таго і цэны значна вышэйшыя, чым у лаўцы ЦРК.

КУЛЬТ-ПРАЦА.

На торфараспрацоўках сярод тысячнай рабочай масы, якая прыехала за сотні вёрст, ніякай культурнай працы не праводзіцца. Тут адміністрацыя пагабінэтнаму глядзіць на гэткія рэчы „дзе там, якая там культпраца ў балоце". З-за памяшканьня няма дзе сабрацца ў вольны час і пачытаць ці паслухаць газэту, няма кутка, а сярод знаходзячыхся там работніц, нават і не спамінаецца аб культурных мерапрыёмствах.

Аб усім пералічаным трэба сказаць, што за выніку ня было-б ніякай гарантыі, калі-б ня было своечасовай чуйлі і правільнай устаноўкі з боку бюро парткалектыву. Толькі сваёй гібкасьцю парткалектыў наблізіўся да мас выкрыў цэлы шэраг недахопаў і памылак на даным прадпрыёмстве, прымусіў гаспадарнікаў узяцца за працу, зазначыў і выкрыў абураючыя зьявішчы.

Пасьля гэткага сыгналу пачалі прымкнацца палепшаньні, як па частцы дастаўкі рабочым добраякасных прадуктаў, таксама і ў галіне пашырэньня і хутчэйшага сканчэньня будаўніцтва. Але ўсё-ж нямала агіднасьцяй так і застануцца агідасьцямі падобнымі да будаўніцтва на фабрыцы.

Кантрольным органам у самым тэрміновым парадку трэба зьвярнуць увагу і расьсьледаваць гэтую справу, бязгаспадарчасьці і прычыны тормазу будаўніцтва.

Апошняе пашыранае пасяджэньне бюро калектыву КП(б)Б в партактывам Добрушы ў сваёй пастанове канкрэтна зазначыла аб цэлым шэрагу недахопаў, як у будаўніцтве торфараспрацовак, так і ў абслугоўваньні рабочых.

Бюро прызнала правільным патрабаваньне рабочых на адчыненым партыйным сходзе торфазаводу аб дастаўцы добраякасных прадуктаў і палепшаньні наогул.

Бюро цалкам згадзілася в актам абсьледаваньня бытавых умоў рабочых Дабрускай больніцай. Адзначыла і прапанавала ў тыднёвы тэрмін скончыць будаўніцтва на торфараспрацоўках, усклаўшы выкананьне пэрсанальна на нам. дырэктара фабрыкі.

Бюро адзначыла аб утварэньні спэцыяльнай камісіі для рассьледваньня і прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у зацяжцы будаўніцтва.

Рабочы Дабрускай папяровай фабрыкі АЛЕСЬ КАЖАМЯКІН.

ХРОНІКА.

ПАДРЫХТОЎКА ДА „ТЫДНЮ АБАРОНЫ".

Тэатральны калектыў „Рабочая сцэна"—у карысьць абароны краіны.

Тэатральны яўрэйскі калектыў «Рабочая сцэна» 14 і 15 ліпеня выяжджае ў м-кі Койданава і Смалявічы для правядзеньня там пастановак, карнавалу і скарбонічнага збору. Увесь гэты збор сродкаў пойдзе ў карысьць фонду абароны краіны. Апроч таго, гэты тэатральны калектыў прыме ўдзел у паходзе ТДА-Авіяхіму, дзе паставіць спэцыяльную пастаноўку на ТДА-Авіяхімаўскую тэму.

Абсталяваньне кутку „Вайсковых ведаў" у садзе „Прафінтэрн".

Да „Тыдню абароны" Дом Чырвонай Армії заключае абсталяваньне ў садзе «Прафінтэрн» кутка „Вайсковых ведаў". Пры кутку апроч экспанатаў вучэбна-паказальнага характару мясцца яшчэ бібліятэка-нерасоўка і пір для стральбы прапішамі.

Мэта арганізацыі кутка—папулярызацыя вайсковых ведаў і дапамога ў працы гурткам вайсковых ведаў.

Парад ячэек ТДА-Авіяхіму.

15 ліпеня а 12-й гадзіне дня адбудзецца парад ячэек ТДА-Авіяхіму.

Усе ячэйкі ТДА-Авіяхіму павінны прыйсьці ў 11 гадзін дня на вборны пункт.

У парадзе прымуць таксама ўдзел ячэйкі Чырвонага Крыжу.

Газаабкурваньне сяброў ТДА-Авіяхіму.

Газаабкурваньне сяброў Менскіх ячэек ТДА-Авіяхіму распачалося з 8 ліпеня і прадаўжацца штодзённа да 22 ліпеня.

З 22 ліпеня па 25 жніўня газаабкурваньне сяброў ТДА-Авіяхіму будзе праводзіцца па сэрадах і нядзелях.

Конкурс на лепшы вэтэрынарны вучастак.

Наркамзем абвяшчэ конкурс на лепшы вэтэрынарны вучастак, вызначэны тры прэміі ў 200, 100 і 60 руб.

Дзеля таго, каб дакладна выявіць якасьць вэтэрынарнага абслугоўваньня насельніцтва, у працягу бліжэйшага месяца Наркамзем будзе зьбіраць допісы ад селькораў, каб на іх падставе намеціць раздачу прэмій.

Павялічэньне пэрсанальнай пэнсіі за баявыя заслугі.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпечэньні пастанавіла павялічыць пэрсанальную пэнсію да 75 р. у месяц былу. радавому чырвонаармейцу Карпаву.

Тав. Карпаў мае цэлы шэраг баявых подвігаў на франтох грамадзянскай вайны.

Мерапрыёмствы да зьнішчэньня накладных выдаткаў.

Белкавпасаюз запрапанаваў спажывецкім саюзам і адазяленьням БКС практыкаваць завоз тавараў трэнзітам у больш буйныя спажывецкія таварыствы. Трэнзітам будуць завозіцца бавоўняная мануфактура, ніткі, галёшы, цьвікі, мыла, чай, махорка і тытунёвыя вырабы.

Пашырэньне пунктаў па продажу марак.

За апошні час па Менскай акрузе значна пашырылася нізавая сетка пунктаў па продажу марак.

Замест 650 пунктаў, якія меліся раней, зараз па акрузе мяцоца да 1000 пунктаў.

Гэтыя пункты маюцца па сельсаветах, школах, кааператывах і хатах-чытальнях.

Забясьпячэньне пшанічнай мукой.

Пачынаючы з 15-га ліпеня, МЦРК распачынае продаж пшанічнай мукі па кілё на пайчыка ў месяц. Мука будзе прадавацца ва ўсіх крамах, за выключэньнем 25, 40, 15 і 16.

Мукі хопіць для ўсіх пайчыкаў.

У мэтах рацыяналізацыі.

Прэзыдыум ЦП саюзу скурнікаў выказаўся за неабходнасьць, у мэтах рацыяналізацыі, ліквідацыі бабруйскай шчацінкай фабрыкі. Ліквідацыя фабрыкі распачнецца ў жніўні і працягнецца каля трох месяцаў. Рабочыя фабрыкі будуць уліты на віцебскую і менскую шчацінныя фабрыкі. Прэзыдыум ЦП саюзу зьвярнуўся з просьбай у Белшчапіну аб аказаньні дапамогі рабочым для падшуканьня кватэр.

Будзе вырабляцца свая каніфоль.

Белкустпрамсаюз дазволіў групе магілеўскіх грамадзян утварыць арцель па выробу каніфолі. Арцель арганізуецца з 40 чал. Трэба адзначыць, што каніфоль дагэтуль увозілася выключна з-заграніцы і паміж іншым спажывалася як сыравіна на мылаварных заводах.

Атрымана партыя гадзіньнікаў.

МЦРК атрымаў партыю гадзіньнікаў: 74 будзільнікі і 74 кішэнёвых. Гадзіньнікі на 50 проц. таньней, як на рынку, і прадаюцца выключна пайчыкам.

Пасылка беспрацоўных на работу.

За чэрвень месяц менская бірка працы паслала на работу 2.070 беспрацоўных, з іх на часовую працу—2.016 чал.

Больш усяго паслала на работу на групе будаўнікоў, працаўнікоў мастацтва і савгандслужачых.

Замежная пародзістая жывёла для БССР.

На днях паступае для Белсельтрэсту з Нямеччыны і Даніі прав Управу Дзяржгандлю БССР партыя пародзістай жывёлы і птушак.

Першая партыя сьвіней ужо паступіла на ст. Бігосава.

Забясьпечаньне кааперацыі прамтаварамі.

Белкавпасаюз у ліпені месяцы для забясьпечаньня спажывецкай кааперацыі маркуе завезьці прамтавараў і хлебапрадуктаў на 2.620.300 руб.

Электрыфікацыя мястэчак і вёсак БССР.

З кожным годам усё больш і больш электрыфікуюцца нашы вёскі і мястэчкі.

У сучасны момант на БССР ужо электрыфікавана 20 мястэчак, 11 вёсак і 12 савгасных гаспадарак.

Ваконнае шкло для БССР.

Праўленьне Продасіліката правяло разьмеркаваньне прадукцыі паўбелага ваконнага шкла на 4-ты квартал.

Па гэтым разьмеркаваньні ў БССР вызначана завезьці паўбелага ваконнага шкла на 4-ты квартал на 102.000 руб.

Курсы бязбожнікаў.

З мэтай падрыхтоўкі новых кадраў актывістаў—бязбожнікаў пры Апа Акруткому КП(б)Б арганізуюцца 2-хтыдневыя курсы.

Курсы разьлічаны на 25 чал.

Заняткамі на гэтых курсах будуць кіраваць спэцыяльна запрошаныя лектары з Масквы.

Абсьледаваньне стану жывёлы.

У Самахвалавіцкім райёне ў сучасны момант Нар. Кам. Земляробства праводзіцца абсьледаваньне буйнай рагатай жывёлы, з мэтай выяўленьня палепшанай пароды.

Гэткае абсьледаваньне сёлета будзе праводзіцца Нар. Кам. Земляробства ў іншых райёнах Менскай акругі, а таксама ў Віцебскай акрузе.

Менскі дзень.

32 тэхнікумы, 30 прафшкол. 15 школ фабзавучу і 7 вучэбна-практычных майстэрняў зараз мясцца на БССР. З бягучага году сетка гэтых вучэбных устаноў будзе яшчэ павялічана.

Заграничную камандыроўку атрымаў старшыня Ўправы Дзяржгандлю БССР у Данію, Нямеччыну, Польшчу і Аўстрыю, з мэтай азнаямленьня з цэлым шэрагам пытаньняў, зьвязаных з экспартам з БССР.

128 электрастанцый магутнасьцю ў 15.000 кілёват мясцца ў сучасны момант па БССР. У сувязі з пускам у 1930 годзе Асінаўскай станцыі магутнасьць усіх электрастанцый БССР дасягне 38.000 кілёват.

2.000 руб. адпусьціў «Камзэт» на правядзеньне карчоўкі ў яўрэйскіх сельска-гаспадарчых калектывах Бабруйшчыны.

Японскі тэатр, які зараз робіць турнэ па СССР, запрошан у Менск на гастролі.

У чэрвені для спажывецкай кааперацыі БССР завезена прамтавараў і хлебапрадуктаў на 2.852.600 руб.

Новую базу будзе будаваць на чыгунцы Белкавпасаюз. Для гэтай мэты адпушчаны спэцыяльныя сродкі.

16 ліпеня адчыніцца пленум ВСНГ БССР. Пленум абгаворыць пытаньне—кантрольныя лічбы на 1928-29 год.

З 1-га ліпеня на месяц зачынілася дзякуючы рамонту, хэміка-бактэрыялягічная лябараторыя ЦРА. Усе аналізы будзе вытвараць Бактэрыялягічны Інстытут.

231.279 руб. атрымана ў 1926-27 г. чыстага прыбытку ад эксплёатацыі боен на БССР.

На рамонт гэтых боен патрачана 46.471 руб.

Жалезныя дзьвярныя окрынкі для апусканьня паштовай карэспандэнцыі і газэт уставаўлівае Наркампашт'ель на жадальню гр-н у іх памяшканьнях.

Кошт скрынкі—1 р. 50 к.

Культурныя навіны.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ПОЛАЧЧЫНЫ.

Студэнцкае т-ва краязнаўства пры БДУ, згодніўшы з ЦБ Краязнаўства, арганізавала пад кіраўніцтвам праф. Пічэты навукова-дасьледчую экспэдыцыю ў Полаччыну. У склад экспэдыцыі ўваходзяць пэраг вядомых вучоных і 25 студэнтаў розных спэцыяльнасьцяй. Экспэдыцыя мае ўсебакова абсьледаваць гісторыю, этнаграфію, археолёгію, эканоміку і інш. галіны жыцьця акругі.

Полацкі АВК асыгнаваў на працу экспэдыцыі 500 руб. Да працы экспэдыцыі будуць таксама прыцягнуты мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі.

Экспэдыцыя прапягнецца адзін месяц.

800 НАСТАЎНІКАЎ НА КУРСАХ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ.

Зараз у Менску працуюць 7 курсаў па падвышэньні кваліфікацыі настаўніцтва, з якіх навучаецца каля 800 асоб.

Працуюць наступныя курсы: акруговыя, цэнтральныя яўрэйскія, цэнтральныя польскія, цэнтральныя—для дашкольніц, дзіцячых дамоў і сядоў, цэнтральныя беларускія 6-ці месячныя і курсы хатчікаў і піянэраў.

60 НАСТАЎНІКАЎ З РСФСР.

На цэнтральных беларускіх курсах знаходзіцца каля 60 настаўнікаў беларускіх школ з розных губкоў РСФСР: Сібіры, Смаленскай і Бранскай губ., Вялікалуцкай акругі, Паўночна-Заходняй воблясьці і інш.

У аснову працы курсаў кладзецца грунтоўнае вывучэньне беларускай мовы і мэтодыка выкладаньня.

Уся праца на курсах вядзецца на беларускай мове

Новае паштовае агенцтва.

6-га ліпеня Менская паштова-тэлеграфная кантора адчыніла новае паштова-тэлефоннае агенцтва на пляцу 25-га Кастрычніка па Ракаўскай вул., дом № 55.

Гэткія паштовыя агенцтвы мяркуецца адчыніць яшчэ на Ляхаўцы і пляцу „Парыскай Камуны".

Пабудова жэлацінага заводу ідзе хуткім тэмпам.

Пабудова жэлацінага заводу ідзе хуткім тэмпам. Ужо ўзьведзены сьцены да вакон.

Матар'яламі работы забясьпечаны, за выключэньнем цэменту.

На работах занята зараз да 100 рабочых.

Апавяшчэньні.

— У панядзелак, 16 ліпеня, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні ВСНГБ, адбудзецца пасяджэньне Пленуму ВСНГ БССР з наступным парадкам дня:

Даклад аб кантрольных лічбах на пяцігодзьдзе і на 1928-29 год па прамысловасьці БССР.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У пятніцу, а 8 гадзіне ўвечары адбудзецца лекцыя прафэсара Ленінградзкага Пэдагагічнага Інстытуту імя «Герцана» т. Кампанейца—на тэму: «Матэматыка ў працоўнай школе».

Запрашаюцца слухачы ўсіх настаўнінкіх курсаў і выкладчыкі матэматыкі г. Менску.

Бліжэйшыя задачы школ сялянскай моладзі.

Усебеларуская канфэрэнцыя працаўнікоў школ сялянскай моладзі паміж іншым абгаварыла даклад Наркамасьветы т. Баліцкага аб месцы ШСМ у сыстэме народнай асьветы БССР і даклад т. Башкевіча аб чарговых задачах будаўніцтва школ сялянскай моладзі.

У сувязі з пастановамі 15-га зьезду партыі задача падрыхтоўкі культурных сялян кааператараў-калектывістых і грамадзкіх працаўнікоў набывае яшчэ большае значэньне, а таму будаўніцтва школ сялянскай моладзі павінна стаць адной з цэнтральных задач народнай асьветы ў БССР.

Вось чаму абгаварэньне дакладаў т. т. Баліцкага і Башкевіча заняло ў канфэрэнцыі многа ўвагі, часу і ў сваёй пастанове канфэрэнцыя ахапіла ўсе бакі будаўніцтва і працы школ сялянскай моладзі.

Канфэрэнцыя працаўнікоў ШСМ лічыць правільным уключэньне школ сялянскай моладзі ў сыстэму народнай асьветы і паступовы пераход яе на 4-хгадовы тэрмін навучаньня. Наркамасьветы павінен увесьці лінію на ўзмацненьне ў ШСМ вытворчай і кааперацыйнай падрыхтоўкі, а таксама і на павялічэньне сеткі гэтых школ як шляхам адчыненьня новых, так і шляхам рэарганізацыі другога канцэнтру сямёхгодкі ў школы сялянскай моладзі.

Зразумела, рэарганізацыя сямёхгодак ні ў якім разе не павінна насіць фармальны характар, а пры правядзеньні рэарганізацыі трэба над школу падводзіць матар'яльны падмурак:—дастатковы земельны вучастак, забясьпечаньне школы агранамамі, арганізацыі інтэрнатаў і г. д.

Канфэрэнцыя адзначыла, што пастановы папярэдняй канфэрэнцыі аб палепшаньні мэтадычнага кіраўніцтва, аб разьмерах гаспадаркі і аб зьмяншэньні каштоўнасьці ШСМ цалкам у жыцьцё не праведзены, але, не зважаючы на гэта, праца школ значна пасунулася наперад, дзякуючы чаму яны набылі твар школы сялянскай моладзі.

Чарговымі задачамі школ сялянскай моладзі пастаўлены выхаваньне селяніна калектывіста. Для гэтай мэты ў праграму ШСМ павінна быць уведзена і правільна пастаўлена выкладаньне кааперацыі і калектывізацыі як асобнай дысцыпліны. Павінна быць зьвернута ўвага на ўзмацненьне грамадзкай працы ізогул і асабліва ў кааперацыйнай галіне. Апрача таго, усёй вытворча-агранамічнай працы павінен быць нададзены грамадзкі характар. Выхаваньне пачуцьця калектывізму і таварыскасьці сярод вучняў, перабудова мэтадаў навучаньня і выхаваўчай працы над вуглому погляду выхаваньня калектывістычных звычак.

Вось усе тыя шляхі, якія намеціла канфэрэнцыя для выхаваньня селяніна-калектывіста.

Уся праца школы сялянскай моладзі павінна выхоўваць у вучняў разуменьне сваёй ролі ў падняцьці сельскай гаспадаркі і яе кааперараваньні. Школа павінна выхоўваць у вучняў сьвядомасьць, што ў вёсцы патрэбен новы чалавек, што бяз новых кадраў перарабіць вёску немагчыма.

Вучэбная гаспадарка школы павінна быць базай вытворчага навучаньня, базай для пастаноўкі тых вопытаў, якія ня могуць быць пастаўлены непасрэдна ў сялянскіх гаспадарках. Разам з тым вучэбная гаспадарка павінна выяўляцца навочным паказам сялянству найбольш важных і даступных апошняму перапрыёмстваў для падняцьця сялянскай гаспадаркі. Пры тых-жа разьмерах гаспадаркі ШСМ, як тое мы назіраем зараз, яна не зьяўляецца мэрай калектывістычнага выхаваньня, а часта прыводзіць да адмоўных вынікаў, бо перагружае вучняў чыста тэхнічнай працай, а гэта ў апошніх стварае агідасьць да гаспадаркі школы і да праны ў ёй. Канфэрэнцыя цьвёрда і рашуча заявіла, што разьмер вучэбнай гаспадаркі школы павінен быць ня больш 8-15 гэктараў зямлі.

У вытворчую працу школы сялянскай моладзі павінны быць унесены моманты адукацыйнага і дасьледчага характару, а вялікая частка прыбытку ад гаспадаркі павінна ісьці ў фонд палепшаньня быту вучняў.

Саміх вучняў неабходна наблізіць да кіраўніцтва гаспадаркай. Лепшымі мэтадамі для ажыцьцяўленьня гэтага будзе ўзмацненьне працы вытворчых камісій, скліканьне спэцыяльных вытворчых нарад і ўцягненьне ўсіх вучняў школы ў абгаварэньне вытворчых плянаў школы.

Адной з важнейшых задач на бліжэйшы час школ сялянскай моладзі зьяўляецца дасягненьне рэнтабельнасьці школьнай гаспадаркі, бо гэта асноўная ўмова для падняцьця аўтарытэту апошняй ня ў вачох вучняў, так і сялян.

Неабходна і надалей імкнуцца да таго, каб кошт утрыманьня ШСМ зьмяншаўся, але разам з тым гэта неазвінна адбіцца на сацыяльным складзе вучняў:—бядняк і батрак павінны застацца асноўным ядром у школе.

Перад кожнай школай сялянскай моладзі стаіць задача бязупынна працаваць над далейшым павялічэньнем прошанту дзяўчат у школе. Для гэтай мэты неабходна пры ўсіх школах арганізаваць гурткі домаводства, кройкі і шыцьця і ўзмацніць працу гэтых гурткоў там, дзе яны існуюць. Побач з гэтым дзяўчаты павінны быць уцягнуты ва ўсё будаўніцтва ШСМ адналькава з хлопцамі. З дзяўчатамі магчыма і неабходна праводзіць асобныя заняткі на тых галінах сельскай гаспадаркі, якія маюць непасрэднае дачыненьне да працы жанчын у вёсцы.

Асабліва востра стаіць задача ўзмацненьня мэтадычнага кіраўніцтва школамі сялянскай моладзі. Канфэрэнцыя выказалася за ўтварэньне вопытна-практыкавальнай школы. На меш востра стаіць пытаньне перападрыхтоўкі настаўнікаў ШСМ,—неабходна будзе ўцягваць настаўнікаў у розныя агранамічныя курсы, а таксама ў курсы і канфэрэнцыі працаўнікоў школ павышанага тыпу.

Абмен плянамі працы, мэтадычнымі распрацоўкамі і абмен вопытам і вынікам працы паміж асобнымі школамі, а таксама устанаўленьне сувязі паміж ШСМ і сельска-гаспадарчымі ўстановамі, у першую чаргу з Беларускім Дзяржаўным Дасьледчым Інстытутам Сельскай і Лясной Гаспадаркі і Беларускім Аддзяленьнем Інстытуту Прыкладной Батанікі,—усё гэта, разам узятае, дапаможа паставіць працу школ сялянскай моладзі на належную вышыню і яна выканае задачу па падрыхтоўцы культурных сялян калектывістых грамадзкіх працаўнікоў.

Зачараванае кола.

(На менскай біржы працы, сэкцыя савецкіх гандлёвых служачых).

Каб атрымаць працу, трэба быць членам саюзу.

Каб уступіць у саюз, трэба мець працу.

Бесспрацоўе сярод савецкіх гандлёвых служачых можна лічыць стабілізаваным. Бухгальтары, памоцнікі і рахункаводы ўсіх разрадаў доўгі час знаходзяцца на вучоце біржы працы і не атрымоўваюць працы. Прычыны вядомы: скарачэньне апарату, рацыяналізацыя і г. д. Усе свае надзеі бесспрацоўныя з сэкцыі разумовай працы ўскладаюць на лета, на час чарговых водпускаў. Надзеі гэтыя часткова апраўдваюцца: хто дастае працу на тыдзень, хто на месяц, хто на два. Але-ж гэтага, зразумела, не хапае на жыцьцё. Нікому ня хочацца быць сталым пэнсіянэрам страхкасы і атрымоўваць дапамогу, дай і дапамога даецца толькі ў працягу 9 месяцаў. Як бы там ні было, вострасьць бесспрацоўя сярод членаў саюзу часта вымяншаецца: саюз і біржа працы па меры магчымасьці дапамагаюць ім.

Але ёсьць адна катэгорыя бесспрацоўных савецкіх гандлёвых служачых, якая застрахавана ад працы на доўгія гады. Я гавару аб тых служачых, якія маюць вялікі стаж працы па найму стаж 18 і нават 20 год, але яны выпадкова па розных прычынах, па хворасьці і інш. аўтаматычна выключаны з саюзу і не пасьпелі ў свой час адзначыць свае ўнёсак у правох членаў саюзу. Становішча гэтых людзей крытычнае,—часам трагічнае: саюз ім гаворыць: знайдзіце працу і мы вас зараз-жа прымем у члены саюзу; біржа працы, дзе яны знаходзяцца на вучоце (і прайшлі экспэртыцу камісію) гаворыць ім: на працу мы пасылаем толькі членаў саюзу.

Як быць з гэтымі людзьмі? Як ім выйсьці з тупіка, з зачараванага кола? Яны-ж таксама маюць права на працу, яны-ж працавалі на найму шмат гадоў в дзяцінстве, і пры савецкай уладзе.

Уласна кажучы, было-б справядліва, каб саюз адзначыў іх у правох членаў саюзу на падставе дакумантаў аб іх стажы. Але саюз савецка-гандлёвых служачых падыходзіць да гэтага пытаньня, да гэтай сур'ёзнай праблемы на падставе фармальнага закону—бесспрацоўнага ў саюз ня прымаць. Можа быць саюз і праў. Але чалавек мае 15-20 год стажу працы на найму, часта кваліфікаваны, чым ён горшы таго, хто працаваў па найму 3-4 месяцы.

Як-жа выйсьці з гэтага? Выхад ёсьць, па маёй думцы наступны: біржа працы (камітэт біржы) павінна некаторы процант гэтых людзей прыраўнаць, пры накіраваньні на працу, да членаў саюзу.

Гэта датычыцца больш нажылых, большага маладых трэба накіраваць як і членаў саюзу у Ц. І. П.

С. Эвэнчык.

Лясныя справы.

ЛЕСААДНАЎЛЕНЬНЕ.

Лесааднаўленьне праведзена сёлета на 1019 гэкт., натуральны засеў займае 600 гэкт., утворана гадавальнікаў на 26 тыс. кв. мэтр.

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ЛЕСАУПАРАДКАВАНЬНЕ.

Сёлета ў Менскай акрузе на лесаўпарадкаваньні працуюць 10 партый: 5—у дзяржаўных лясох і 5—у лясох мясцовага значэньня. У дзяржаўных лясох мае быць упарадкавана каля 100 тысяч гэкт., у лясох мясцовага значэньня—каля 30 тыс. гэкт.

Сёлета ў акрузе будзе лесаўпарадкавана, дзьве трэцях лясоў дзяржаўнага значэньня і адна трэць лясоў мясцовага значэньня.

ВЫНІКІ «ДНЮ ЛЕСУ».

Па Менскай акрузе ў часе сёлетняй кампаніі «Дзень Лесу» было засаджана 67 гэкт. лесу, пасеена 183 гэкт., утворана гадавальнікаў—на 10200 кв. мэтр., засаджана розных прысад—17 кіл., каля сядзіб, школ і розных устаноў—6000 дрэў, зроблена падчыстка на 330 гэкт. і агароджана 33 гэкт.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	З аўторка 10 ліпеня „ЗАКОН ГОР" у 8 частках. У галоўнай ролі вядомы грузінскі артыст Бостаеў. УВАГА! У выпадку дрэннага надвор'я сэансы пераносяцца ў кіно „Культура" (Зімні будынак—Валадарскага 7).
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка 10 ліпеня „ЦЁМНЫЯ СІЛЫ" у 8 частках. Зьвыш прагра